Пралетарыі усіх кра[illegible]

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. сяльская — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капарэлі насьпрад тэксту 1 р. — к. За радок капарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Бесплацэўн. і чырвонаармейцы за дакумент 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 68 (2256) Серада, 21-га сакавіка 1923 г

Аб ходзе беларусізацыі культурнай працы прафсаюзаў БССР.

(Рэзалюцыя Бюро ЦК КП(б)Б, прынятая 17 сакавіка 1928 году).

Заслухаўшы даклад фракцыі ЦСПСБ аб ходзе беларусізацыі прафсаюзнай культурнай працы, Бюро ЦК КП(б)Б адзначае зьдзьвіг у гэтай галіне прафсаюзнай працы і ўзяты напраміак забясьпечыць далейшае разгортваньне беларусізацыі рабочае клясы.

1. Бюро ЦК КП(б)Б ставіць перад прафэсыянальнымі арганізацыямі беларусізацыю, як першачарговую задачу, бо невыкананьне ставячайся перад прафэсыянальнымі арганізацыямі задачы можа выклікаць паслабленьне кіраўніцтва рабочае клясы сялянствам.

2. Пры правядзеньні беларусізацыі працы павінна праводзіцца на аснове дабраахвотнасьці, прычым саюзныя арганізацыі павінны пашырыць і ўзмацніць растлумачэньне ў штодзённай працы важнасьці і неабходнасьці вывучэньня рабочай клясай беларускае мовы, а таксама і зразуменьне чарговых задач партыі і савецкае ўлады па далейшаму правядзеньню нацыянальнай палітыкі.

3. У першую чаргу прапанаваць прафэсыянальным арганізацыям ускорыць тэмп вывучэньня беларускай мовы прафсаюзным актывам і абавязаць прафэсыянальны актыў, які зараз уладае беларускай мовай у штодзённай працы і наогул у жыцьці абавязкова ўжываць беларускую мову і тым самым служыць прыкладам для ўсёй прафсаюзнай масы.

4. У мэтах паглыбленьня беларусізацыі ў прафсаюзнай культурнай масавай працы сярод прафсаюзнае масы, праца павінна праводзіцца ў клюбах, чырвоных куткох, шляхам: чытак мастацкіх беларускіх твораў, лекцыяў, дакладаў па гісторыі Беларусі і яе культуры, арганізацыі дысвутаў, літаратурна-мастацкіх, драматычных, харавых гурткоў, а таксама музычных і рабкораўскіх, масавых беларускіх мастацкіх пастановак; выданьня насьценных газэт, а таксама павялічэньня выпіскі беларускай пэрыядычнай літаратуры (газэты, часопісі і г. д.) і выданьне літаратуры на беларускай мове.

5. Адзначаючы слабы тэмп папаўненьня беларускай літаратурай бібліятэк, клюбаў і перасовак, прапанаваць усім прафэсыянальным арганізацыям сілаўсці канкрэтныя пляны сыстэматычнага папаўненьня бібліятэк беларускай літаратурай, адначасова забясьпечыўшы папаўненьне іх літаратурай на іншых мовах.

6. Надаючы асаблівае значэньне беларусізацыі саюзнай працы і прафсаюзнай масы, знаходзячайся ў вёсцы, якія як у сваёй працы, гэтак і ў быту датыкаюцца сялянскай масы,—Бюро ЦК КП(б)Б асабліва зварочвае ўвагу фракцыі ЦП саюзаў, маючых свае арганізацыі на вёсцы, асабліва тых, якія да гэтага часу яшчэ поўнасьцю не пераявілі сваю працу і абслугоўваньне прафсаюзнае масы на беларускую мову (саўгандыслужачых, СГЛР, мэдсанпрацы і г. д.) на неабходнасьць прыняцьця больш рашучых мерапрыёмстваў па пераводу працы і культурнага абслугоўваньня мас на беларускую мову.

7. Адзначаючы слабую працу шэрагу прафсаюзаў (чыгуначнікаў, хэмікаў, мэталістаў, будаўнікоў і г. д.) на ўнядрэньне беларускай мовы ў рабочую масу, Бюро ЦК КП(б)Б прапануе вышэйпаманёным саюзам узяць больш рашучы напрамак на ўнядрэньне беларускай мовы ў рабочую масу шляхам пераводу культурна-масавай працы на беларускую мову, адначасова забясьпечваючы іншыя нацыянальныя меншасьці на іх роднай мове.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і фракцыі ЦСПСБ абавязкова забясьпечыць, каб ліквідацыя няпісьменнасьці сярод беларускага насельніцтва праводзілася выключна на беларускай мове, а ў школе, якія працуюць на іншых мовах, абавязкова забясьпечыць выкладаньне беларускай мовы.

9. У сувязі з безадкладнай неабходнасьцю значнага ўскарэньня тэмпу беларусізацыі шырокіх мас прафсаюзаў, дзеля больш здавальняючага ўдзельнічаньня іх у сацыялістычным будаўніцтве, дзеля больш поўнага кіраўніцтва з боку рабочае клясы сацыялістычным будаўніцтвам у краіне, большасьць насельніцтва якой беларусы, Бюро ЦК КП(б)Б прапануе ўсім мясцовым партыйным органам узмацніць сваё кіраваньне фракцыямі прафсаюзаў у справе беларусізацыі, упягнуўшы ўсю партыйную масу ў гэту працу. Больш рашуча дабіцца таго, каб партыйцы ў першую чаргу скарэй вывучылі беларускую мову, і тым самым сваім прыкладам упягвалі ў справу беларусізацыі ўсю прафсаюзную масу.

На працэсе Грамады.

ЯК ПЁНСЯ АБВІНАВАЎЧЫ МАТАР'ЯЛ.

У адзінаццаты дзень працэсу „Грамады" дапытваліся сьведкі, пакліканыя дзеля сьцьвярджэньня віны абвінавачанага б. пасла сойму Мятлы. Між іншым, дапытваўся сьведка А. Скулацкі, які нейкі час пражываў у доме абв. Мятлы. Ён сьцьвярджае, што ведае, быццам Мятла вазіў літаратуру ў Дзісну, быццам на адным з сходаў Мятла асьведчыў, што трэба прыгатавацца да перавароту, быццам Мятла даваў пропускі ў СССР.

Пракурор Калайскі *пытаецца: у першапачатковым следзтве вы казалі аб тым, быццам Мятла казаў, што „трэба выразаць паноў".*

Сведка. *Так мне загадаў сказаць камэндант пастэрунку Майхроўскі.*

Пракурор Калайскі. *Ці ўсё тое, аб чым вы раней казалі, загадаў у сваім часе сказаць Майхроўскі?*

Сьведка. *Не, толькі аб тым, што трэба выразаць паноў.*

Адв. Абрамовіч. *Чаму вы жылі ў родных Мятлы?*

Сьведка. *Прыехаў на работы.*

Адв. Абрамовіч. *А ці ня былі вы выпадкам агэнтам паліцыі?*

Сьведка. *Не, але аба мне так казалі.*

Адв. Абрамовіч. *Ці вы часта гаварылі ў паліцыі аб тым, што кажуць работнікі?*

Сьведка. *Адзін раз у тыдзень, часамі часьцей.*

„Кур'ер Віл." (№ 63), які вымагае вышэйпаданую інфармацыю, зазначае:

«Сітуацыя выясьнілася і абарона перастае задаваць запытаньні», г. зн., для ўсіх становіцца ясным, што сьведка А. Скулацкі зьяўляецца „афярай вышэйшых сфэр", якім трэба было знайсьці агэнтаў для ілжывых паказаньняў на судзе.

ЗАДАЧЫ МІЖНАРОДНАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА РУХУ.

З дакладу тав. Лазоўскага на IV кангрэсе Прафінтэрну.

МАСКВА, 19-III. 19-га сакавіка на раніцы і вечарнім пасяджэньнях кангрэс Прафінтэрну заслухаў даклад Лазоўскага аб вынніках і чарговых задачах міжнароднага прафруху.

Капіталізм,—сказаў Лазоўскі,—перажывае палазу надзвычайна абвостранае барацьбы за сусьветнае палітычнае і эканамічнае панаваньне. Няўстойчывасьць капіталістычнае сыстэмы ўзмацняецца эканамічным і палітычным ростам СССР. Буйнейшыя капіталістычныя дзяржавы падрыхтоўваюць, з аднаго боку, вайну адна проці другое, а з другога,—спрабуюць заснаваць між сабою адзіны фронт для супольнага выступленьня проці СССР.

Буйнейшыя эканамічныя канфлікты між працаю і капіталам скончыліся для рабочых няўдачаю, з прычыны арганізацыйнае адрапырыёмцаў і адсутнасьці адзінага фронту ў рабочым руху. Рэфармісцкія прафсаюзы фактычна зрасьліся з арганізацыямі прадпрыёмцаў. Шчыльнае супрацоўніцтва капіталу і рэфармізму выклікае рост недавер'я мас да рэфармісцкіх прагадыроў і спробы самастойных выступленьняў пралетарыяту проці капіталу, проці волі рэфармісцкіх правадыроў.

Гэтыя паводзіны мас прывялі да росту ідэйнага ўплыву Прафінтэрну ва ўсіх краёх. Прыхільнікам Прафінтэрну належыць памятаць, што для забясьпечаньня перамогі ў эканамічных бойках неабходна выгнаць штрэйкбрэхераў і агентаў капіталу з кіруючых органаў рэфармісцкага прафруху.

У той час, як ва ўсіх капіталістычных краёх ідзе палітычны і эканамічны наступ на рабочую клясу і яго прафарганізацыі, у СССР роля прафсаюзаў у палітычным і гаспадарчым жыцьці краю расьце. Эканамічнае становішча рабочых мас паляпшаецца. Гэтым тлумачыцца прыцягваючая сіла СССР для рабочых усіх краёў і рост нянавісьці міжнароднае буржуазеі да адзінае ў сьвеце рабочае дзяржавы. Ва ўсіх кампаніях буржуазеі проці левых рабочых і проці СССР Амстэрдамскі Інтэрнацыянал займае першае месца.

Асноўным лёзунгам Прафінтэрну павінен БЫЦЬ АДЗІНЫ ФРОНТ ЗЬНІЗУ, неаорэдна ў прадпрыёмствах, у нізавых зьвяньнях рэфармісцкіх прафсаюзаў. Тактыка адзінотва грунтуецца не на перапісцы і нічога нязначачых перамовах, а на арганізацыі ў сучасны момант неарганізаваных мас. Праграма дзеяньняў Прафінтэрну ў барацьбе проці павялічэньня рабочага дню, за 7-мігадзінны рабочы дзень, як максімум, і за 6-цігадзінны рабочы дзень на працы ў капальнях, у шкодных прадпрыёмствах і для недалетка́ў да 18-ці гадоў, у барацьбе проці зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню і за павышэньне рэальнага заработку, за разгорнутую прафсаюзную дэмакратыю, за ўцягваньне некваліфікаваных і неарганізаваных рабочых у прафсаюзы, проці фашысцкіх, жоўтых і нацыяналісцкіх прафсаюзаў, проці абавязковага арбітражу, проці падкачаленьня канфліктаў між працаю і капіталам буржуазным судом, за адзіны фронт і за братэрскі саюз у барацьбе рабочых проці капіталу і буржуазнае дзяржавы.

„Згода" між Англіяй і Нанкінам.

ТОКІЁ, 19-3. Паведамляюць, што згода, распрацаваная нанкінскім міністрам замежных спраў Хуан-Фу і англійскім пасланьнікам у Кітаі Майльс Лемпсонам зводзіцца да наступнага: 1) Англія прызнае, што нанкінскі інцыдэнт быў выкліканы камуністамі і што, значыць, нанкінскі ўрад не адказвае за інцыдэнт; 2) згода між Нанкінам і Англіяй не павінна парушаць незалежнасьці Кітаю; 3) пытаньне аб кампэнсацыі за страты будзе расьследавана аб'яднанаю камісіяю—з прадстаўнікоў Англіі і Нанкіну.

ГОР. ГУЙЛАЙ ЗАХОПЛЕН КАМУНІСТАМІ.

ШАНХАЙ, 19-3. З Кантону паведамляюць, што камуністычныя атрады захапілі горад Гуйлай (на ўсходзе правінцыі Гуандунь, на поўдзень ад Сватоу).

АБГАВОР ПРАЭКТУ САВЕЦКАЕ КАНВЭНЦЫІ У КАМІСІІ АБ РАЗБРОЕНЬНІ

Выступленьне старшыні дэлегацыі СССР тав. Літвінава.

ШЫРОКІЯ МАСЫ УСЯГО СЬВЕТУ ГОРАЧА ВІТАЮЦЬ САВЕЦКІЯ ПРАПАНОВЫ.

УРАД СССР ЯШЧЭ РАЗ ЗАЯЎЛЯЕ АБ СВАЁЙ ЗГОДЗЕ ЛІКВІДАВАЦЬ УЗБРОЕНЬНІ І ПЫТАЕ ІНШЫЯ КРАІ: ЦІ ЗГОДНЫ ЯНЫ РАЗБРОІЦЦА?

ЖЭНЕВА, 19-3. Сёньняшняе пасяджэньне падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні адчынілася а 4-й гадзіне дню. Старшыня Ляўдон вітае прысутнасьць турэцкае дэлегацыі на чале з Тэўфік Рушдыбеем. Далей Ляўдон прапануе ўхваліць рэзалюцыю па пытаньні аб працы камітэту безапасьнасьці і арбітражу. Рэзалюцыя прапануе ўзяць да ведама вынікі працы камітэту і зацьвердзіць плян далейшае працы. Рэзалюцыя ўхваляецца без сярэчак.

Старшыня турэцкае дэлегацыі Тэўфік Рушды-бей выказвае ўдзячнасьць за запросіны Турцыі і заяўляе: „Турцыя згодна актыўна ўдзельнічаць у працы, якая мае на мэце адхіліць небясьпеку вайны. Турцыя аддае перавагу працадуры пагодженьня, бо яна стварае асабліва спрыяючыя ўмовы пагоджаць канфлікты ў прыцельскай атмасфэры. У сучасных міжнародных адносінах нельга марыць пра ідэальнай безапасьці; трэба бяспаволеным адносаю, а такую могуць даць угаворы аб ненападзе і нейтралітэце". Тэўфік Рушды-бей прапануе камісіі азнаёміцца з угаворамі гэтага тыпу.

Камісія пераходзіць да абмеркаваньня савецкага праэкту разброеньня. Слова мае старшыня савецкае дэлегацыі Літвінаў.

Прынцыповыя палажэньні праэкту.

Літвінаў кажа: «Савецкі праэкт канвэнцыі аб усеагульным, поўным і неадкладным разброеньні, пасланы месяц назад дэлегацыяй СССР генэральнаму сэкратару Лігі Нацый, аснован цалком і поўнасьцю на тых прынцыповых палажэньнях, якія былі высунуты савецкай дэлегацыяй у лістападзе на сэсіі падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні. Пры гэтым праэкт прадугледжвае ўжо праз год пасьля набыцьця моцы канвэнцыяй прывесьці сухаземныя, марскія і паветрыныя сілы ўсіх дзяржаў у такі стан, які перашкодзіць выкарыстаць іх для вайны. Гэтым значна абмяжоўваюцца магчымасьці ўзброеных стычак нават да ажыцьцяўленьня поўнага разброеньня.

Я дазволю сабе напомніць камісіі, што на 4-й сэсіі падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні ня было зроблена спробы сур'ёзна абмеркаваць савецкія прапановы. У часе надзвычайна кароткіх спрэчак па гэтым пытаньні ня было высунута ніводнага хоць крыху сур'ёзнага доводу проці савецкае прапановы. Савецкая дэлегацыя, вядома, ня можа лічыць дзелавою крытыкаю заявы, накшталт таго, што савецкі праэкт надзвычайна просты, ці што ў выпадку ўсеагульнага разброеньня народы ўсё-ж такі будуць весьці між сабою войны няўзброенымі і неарганізаванымі масамі пры дапанозе кіёў, сьцізорыкаў, ці пушчаючы ў ход кулакі. Праўда, на 4-й сэсіі падрыхтоўчае камісіі рабіліся спробы казаць нават, што наш праэкт не навіна, прычым Бэнэш намінаў пра пейкую, нібы пададзеную ў Лігу Нацый нарвэскую прапанову, падобную на нашу. Я ўзяў на сябе працу праверыць гэтае заявэньне па матар'ялах Лігі Нацый. Я не знайшоў аніякіх сьлядоў прапановы аб усеагульным і поўным разброеньні. На пасяджэньні 3 камісіі Лігі Нацый (па пытаньнях разброеньня) у 1924 годзе нарвэская дэлегацыя гаварыла аб пажаданьнях, выказаных міжпарляманцкім камітэтам наконт скарачэньня вайсковых бюджэтаў напалову ў працягу 10 гадоў; пры гэтым рабіліся агаворкі, што вайсковыя выдаткі, зробленыя асобнымі дзяржавамі ў моц патрабаваньняў статуту Лігі Нацый, не ўваходзяць у падлягаючыя скарачэньню бюджэты. Дацкая дэлегацыя, спасылаючыся на той самы міжпарляманцкі камітэт, выказала пажаньне скараціць сухаземныя сілы ўсіх краёў, у адпаведнасьці з пастановаю Сэн-Жэрменскага мірнага ўгавору, г. зн. надаць кожнай дзяржаве права мець армію з разрахунку 5 тысяч салдат на 1 міліён жыхароў; а марскія-ж сілы скараціць у адпаведнасьці з Вэрсальскім угаворам, г. зн. пакінуць 2-4 тысячы тон на 1 міліён жыхароў. Водлуг гэтага разрахунку СССР, напрыклад, мог-бы мець армію амаль што ў 735 тысяч чалавек, г. з. павялічыць сучасную сваю пастаянную армію на 175 тысяч чалавек, а флёт—па 200 тысяч тон.

Вось гэта самыя радыкальныя думкі, якія выказваліся калі-небудзь у Лізе Нацый у галіне разброеньня.

Можна лічыць бясспрэчным, што прапанова аб поўным і ўсеагульным разброеньні пададзена ў Лігу Нацый і наогул зьявілася ў справе міжнародных дачыненьняў упершыню. Савецкая дэлегацыя, імкнучыся паскорыць абмеркаваньне свайго праэкту і гэтым наблізіць пачатак сапраўднага разброеньня, усё-ж такі згадзілася перанесьці абмеркаваньне сваіх прапаноў на сучасную сэсію, каб даць усім сябром камісіі і іх урадам магчымасьць падрыхтавацца да дзелавога абмеркаваньня гэтых прапаноў. Зрабіўшы ўсё магчымае, каб палегчыць умовы такога дзелавога абмеркаваньня, савецкая дэлегацыя мае права дамагацца іменна безадкладнасьці такога абмеркаваньня.

Ажыцьцяўленьне савецкага праэкту, які прадугледжвае ўсеагульнае разброеньне, не [illegible] перашкоды, няўхільныя пры правядзеньні частковага скарачэньня ўзброеньняў. Усякаму зразумела, што, напрыклад, кантроль над правядзеньнем усеагульнага разброеньня значна больш лёгкі, чымся кантроль над правядзеньнем часткавага разброеньня.

Далей, я хацеў-бы зазначыць, што прапанаванай савецкай дэлегацыяй аснова разброеньня зьяўляецца самаю справядлівою і не павінна выклікаць супярэчаньняў з боку асобных краёў, бо яна аднатыповая і яе можна прыстасаваць да ўсіх дзяржаў.

ЗЬДЗЕК ЖЭНЕЎСКІХ „МІРАЛЮБЦАЎ" НАД РАЗБРОЕНЬНЕМ.

САВЕЦКІ ПРАЭКТ БУДЗЕ МАРЫНАВАЦЦА Ў ПАДКАМІСІЯХ.

ЖЭНЕВА, 18-3. У сучасны момант, на думку жэнеўскіх палітычных колаў, можна лічыць выражаным, што савецкі праэкт канвэнцыі аб разброеньні будзе перададзен на разгляд падкамісіі ў складзе сямі сяброў. У падкамісію ўвойдуць 5 прадстаўнікоў дзяржаў, якія маюць пастаянае месца ў радзе Лігі Нацый, прадстаўнік СССР і Злучаных Штатаў.

Чакаюць, што праца падрыхтоўчае камісіі да канфэрэнцыі аб разброеньні скончыцца на гэтым тыдні.

Час перайсьці ад размоў да справы.

Пададзены на разгляд камісіі праэкт савецкае дэлегацыі зьяўляецца адзіным арганічным цэлым, які ня можа быць падзелены на часткі, таму савецкая дэлегацыя будзе дамагацца паўтрэднята адказу адносна выпікаў агульнае дыскусіі—ці прымаецца камісіяй прынцып усеагульнага разброеньня ў паказаны ў праэкце пэрыяд часу, а таксама ці ўхваляецца прапанова аб такім тэмпе разброеньня, які зрабіў-бы нематчымым вайну ўжо пасьля аднаго году.

За мінулыя пасьля 4-е сэсіі падрыхтоўчае камісіі 3 месяцы яна пасьпела пераканацца, што ідэя поўнага разброеньня спаткана і ўспрынята з захапленьнем шырокімі масамі абедзьвюх паўкуляў і ўсімі прагрэсыўнымі міралюбівымі элемэнтамі чалавецтва. Аб гэтым сьведчаць, між іншым, атрыманыя і атрымліваемыя мною шматлікія лісты і рэзалюцыі са спачуваньнем ад рабочых партый, шмат якіх арганізацый, груп і таварыстваў з усіх частак сьвету. Учора тут мною была атрымана калектыўная заява, падпісаная прадстаўнікамі 124-х арганізацый, пераважна жаночых, налічваючых шмат міліёнаў членаў у 13-ці краёх: «Мы дамагаемся,—гаворыць гэтая заява,—з усёй сілаю, якую толькі маем, каб члены камісіі абмеркавалі расейскія прапановы з найбольшаю дакладнасьцю і рашучасьцю і падалі міжнароднай канфэрэнцыі аб разброеньні канкрэтны плян поўнага разброеньня ўсяго сьвету ў працягу пэўнага пэрыяду часу». Пад заявай 163 подпісы сэкратароў адпаведных арганізацый.

Гутарка цяпер ідзе аб дзелавым пераходзе да ажыцьцяўленьня разброеньня. Гутарак аб разброеньні, нам здаецца, было ўжо больш чымся даволі, асабліва ў асяродку Лігі. Я дазволю сабе падаць членам камісіі даведку, з якое яны ўбачаць, што апрача агульных зборaў Лігі Нацый і рады Лігі Нацый, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб разброеньні на 30 сэсіях—розныя камісіі і іншыя органы Лігі прысьвяцілі гэтаму пытаньню звыш 120 сэсій—заўважце—не пасяджэньняў; агульным зборам і радаю Лігі было ўхвалена 111 рэзалюцый.

Савецкая дэлегацыя лічыць, што ўжо час такому становішчу, якое можа дыскрэдытаваць самую ідэю разброеньня, пакласьці канец. Савецкі ўрад занаты вялізарнаю задачаю пабудовы вялізнае 150 міліённае дзяржавы на зусім новых пачатках пры адкрытых пэрашкодах з боку ўсяго сьвету; ён ня стаў-бы адхіляцца ад гэтае працы, калі-б не адносіўся самым сур'ёзным і шчырым парадкам да праблемы міру, ажыцьцяўленьне якога зьяўляецца галоўным стрыжанём усяго яго палітыкі.

Чаго патрабуе савецкая дэлегацыя.

Мы ведаем, што нясур'ёзныя людзі робяць выгляд, нібы яны бачаць супярэчнасьці між міралюбівымі прапановамі савецкага ўраду і фактам утрыманьня і ўдасканаленьня Чырвонае армії. Прапарцыянальна жыхарству Саюзу і даўжынёю яго граніц СССР ужо цяпер мае невялікую армію, а тым болей флёт, чымся іншыя дзяржавы. Разам з тым Савецкаму Саюзу процістаіць увесь іншы сьвет, які адкрыта выяўляе сваю варожасьць да повае дзяржавы. Вялізная колькасьць краёў да гэтае пары ня прызнала існуючага ўжо ў працягу 10-ці гадоў савецкага ўраду; няпрызнаньне зьяўляецца нічым іншым, як актам варожасьці. Але і прызнаўшыя савецкую дзяржаву краі, за малым выключэньнем, дазваляюць сабе варожыя крокі ў адносінах да СССР, якія вельмі часта зьяўляюцца сур'ёзным выпрабаваньнем доўгацярпілівасьці і ціхамірлівасьці савецкага ўраду. Новая Савецкая дзяржава бачыла сваю тэрыторыю занятаю чужаземным войскам, якое ўчыняла вялікую шкоду дзяржаве, ад выпікаў якое яна да гэтае пары яшчэ не пазбавілася. Яшчэ да гэтага часу частка тэрыторыі ранейшае Расейскае імпэрыі, жыхарства якое адкрыта імкнецца ў Савецкі Саюз, акупавана чужаземным войскам. Пры ўсім гэтым Чырвоная армія за ўвесь час свайго 10-цігадовага існаваньня застаецца і дасюль выключна збройю абароны.

Савецкі ўрад заяўляў і заяўляе, што ён гатоў поўнасьцю ліквідаваць узброеныя сілы Саюзу, згодна свайго праэкту, як толькі такая-ж пастанова будзе ўхвалена і будзе адначасна ажыцьцяўляцца іншымі дзяржавамі.

Савецкі ўрад пытае іншыя дзяржавы, ці гатовы яны? На гэтае запытаньне савецкі ўрад чакае адказу на пленуме гэтае сэсіі. Адказ на гэтае запытаньне павінен быць дадзены, на думку савецкае дэлегацыі, зусім адкрыта і гласна пад кантролем грамадзкае думкі.

Асноўнымі запытаньнямі, якія выплываюць з нашых прапаноў, зьяўляюцца наступныя: паперша—ці згодна падрыхтоўчая камісія да канфэрэнцыі па разброеньні пакласьці ў аснову сваёй далейшай працы прынцып усеагульнага і поўнага разброеньня ў працягу прапануемага намі тэрміну і, падругое, правесьці першы этап разброеньня з такім разрахункам, каб ужо пасьля аднаго году ўскладніць, калі не зрабіць зусім немагчымым, вядзеньне вайны.

Савецкая дэлегацыя лічыць сябе ў праве асабліва спадзявацца на падтрыманьне дэлегацыі таго ўраду, які выступае ў сучасны момант публічна з прапановаю аб забароне вайны. Шчырасьць гэтае прапановы не магла-б быць больш пераконваючым чынам падмацавана, чымся далучэньнем да савецкага праэкту канвэнцыі аб поўным разброеньні, які мае на мэце ня толькі маральную забарону, але і зьнішчэньне магчымасьці вайны.

Савецкая дэлегацыя ўпэўнена, што ўсе прысутныя тут дэлегацыі ўлічаюць адказнасьць вырашэньня пастаўленага пытаньня, таму савецкая дэлегацыя ня ўхіліцца публічна выказаць пункт гледжаньня свайго ўраду.

Дэлегацыі Нямеччыны і Турцыі падтрымліваюць савецкія прапановы.

Заява Бэрнсдорфа і Рушды-бея ў адказ на выступленьне Літвінава.

ЖЭНЕВА, 19-III. Пасьля прамовы Літвінава, якая была выслухана з напружанаю ўвагаю і зрабіла вялічэзнае ўражаньне, ад імя нямецкае дэлегацыі выступіў Бэрнсдорф.

Трэба прызнаць,—кажа Бэрнсдорф, што Ліга Нацый зрабіла накуль-што ў пытаньні аб разброеньні вельмі мала. Савецкая прапанова можа даць працам падрыхтоўчае камісіі новы імпульс. Савецкі праэкт зусім выразна зазначае на тую канчатковую мэту, да якое камісія павінна імкнуцца. З гэтае прычыны нямецкая дэлегацыя шчыра вітае савецкую прапанову. Бэрнсдорф заяўляе, што вельмі ўважліва азнаёміўся з прапановаю СССР і знайшоў у ёй надзвычайна цікавыя ідэі, заслугоўваючыя вялікае ўвагі і здольныя стаць вельмі карыснымі ў працы падрыхтоўчае камісіі. Бэрнсдорф прапануе пасьля агульных выступленьняў заняцца дакладным вывучэньнем прапановы СССР.

Бэрнсдорф таксама шчыра падтрымлівае прапанову Літвінава ўжо зараз устанавіць час скліку міжнароднае канфэрэнцыі аб разброеньні.

Выступіўшы пасьля гэтага старшыня турэцкае дэлегацыі Тэўфік Рушды-бей (турэцкі міністр замежных спраў) заяўляе, што савецкая дэлегацыя, падаўшы сваю прапанову аб усеагульным разброеньні, даказала сваю адданасьць ідэалу міру. Калі нават,—зазначае Тэўфік Рушды-бей,—гэтая прапанова можа паказацца вельмі радыкальнаю, дык яна ўсё-ж такі дасьць магчымасьць абмеркаваць пытаньне на ўсёй яго шырыні. Старшыня турэцкае дэлегацыі вітае СССР, як суседні і прыцельскі Турцыі край, з гэтаю дзейнасьцю, накіраванаю на замацаваньне міру. Турцыя лічыць сваім абавязкам перад чалавецтвам падаць сваё супрацоўніцтва ў гэтай працы, якая мае на мэце пакласьці канец жахам вайны.

Тэўфік Рушды-бей заяўляе, што з прычыны ўсеагульнае цікавасьці, выкліканае гэтым пытаньнем у грамадзкай думцы ўсіх краёў, праэкт савецкае дэлегацыі павінен абмяркоўвацца на пленарным пасяджэньні падрыхтоўчае камісіі.

Савецкі праэкт на шведзкай мове.

СТАКГОЛЬМ, 19-3. Пацыфісцкае выдавецтва „Новыя Шляхі" выдала асобнай брашурай савецкі праэкт разброеньня. Праэкту прысьвечан артыкул вядомага пацыфіста—бургомістра Стакгольму Ліндхагена, які адзначае вялічэзнае значэньне савецкага праэкту.

„Гарачае" спатканьне камісіі Саймона ў Лягоры.

МАГУТНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ЖАЛОБЫ.

КАБУЛ, 19-3. У зьвязку з прыездам камісіі Саймона ў Лягор, адбыліся вялікія дэманстрацыі пратэсту. Ля вакзалу зышоўся шматлюдны натоўп з чорнымі сьцягамі і плякатамі. Калі сябры прыехаўшае камісіі праяжджалі па вуліцах на аўтамабілях, дэманстранты пасталі абапал вуліцы калёнамі. З радоў дэманстрантаў чуліся выгукі: „Ганьба! Саймон прэч адсюль".

Пасьля праезду сяброў камісіі ў назначанае для іх памяшканьне большая частка дэманстрантаў разышлася. Рэшта-ж лікам блізка 800 чалавек наскочыла на дом банкіра, які агітаваў проці нацыянальнае жалобы, абвешчанае ў знак пратэсту проці прыезду камісіі Саймона.

ПАРЛЯМАНТ АДХІЛІЎ АСЫГНАВАНЬНІ НА КАМІСІЮ САЙМОНА.

КАБУЛ, 19-III. Пры абмеркаваньні бюджэту ў індыйскім законадаўчым зборы старшыня збору Матылял Нэру прапанаваў выключыць з бюджэту асыгноўку на ўтрыманьне камісіі Саймона. Прапанова Нэру выклікала выступленьне шмат якіх прамоўцаў, якія падкрэсьлівалі, **ШТО КАМІСІЯ САЙМОНА «НАВЯЗАНА ІНДЫЙСКАМУ НАРОДУ»,** *і падтрымалі прапанову Нэру. Нэру, падсумоўваючы вынікі спрэчак, заявіў:* **«НЯХАЙ СЯБРОМ КАМІСІІ САЙМОНА ПЛАЦЯЦЬ ТЫЯ, ХТО ІХ НАЙМАЎ».**

Не зважаючы на выступленьне прадстаўніка ўраду ў абарону асыгноўкі, прапанова Нэру ўхвалена большасьцю 66-ці проці 55-ці галасоў.

Камуністычная дэманстрацыя ў Атэнах.

ВЕНА, 19-3. Водлуг паведамленьня з Атэн, учора там адбывалася дэманстрацыя пратэсту проці палітыкі ўраду, наладжаная камуністамі. У дэманстрацыі брала ўдзел некалькі тысяч чалавек. Між жандарматамі і дэманстрантамі здарылася сутычка, у часе якое паранена два афіцэры. Шмат дэманстрантаў арыштавана.

Прыезд дэлегацыі СССР па перамовах з Нямеччынаю.

МАСКВА, 19-3. 19-га сакавіка ў Маскву вярнуліся з Бэрліну старшыня савецкае дэлегацыі па эканамічных перамовах з Нямеччынаю члены калегіі НК Гандлю СССР Шлейфэр і член дэлегацыі—начальнік угаворна-прававога кіраўніцтва НК Гандлю СССР Бауфман і загадчык пададзелу гандлевае палаты эканамічна прававога аддзелу НК Замежных Спраў Розэнблюм.

„АРХІВОРЫУС" СТУДНІЦКІ.

(Сьведка абвінавачаньня на працэсе «Грамады»).

Сярод сьведкаў абвінавачаньня, якія выступалі ўжо на працэсе „Грамады", зьявярнуў на сябе ўвагу вядомы па віленскім групне, як чорнасоценны дзоч і спэц па прасьледваньню беларускага руху і паасобных беларускіх дзеячоў—пан Студніцкі.

Цяпер Студніцкі займае пасаду загадчыка Віленскага Дзяржаўнага Архіву, а калісьці—яшчэ пры пары—ён служыў у тымжа архіве маленькім чыншчыкам і паспэцыялізаваўся ў падробках розных дакумантаў, якія патрэбны былі розным панкам, каб даказаць на судзе сваё шляхэцкае паходжаньне.

У Вільні гаварылі аб гэтай спэцыяльнасьці п. Студніцкага, як аб рэчы вядомай. Нават такая высокапастаўленая асоба, як «генэральны камісар усходніх земель» п. Асмалоўскі в абрыдай амаль ні публічна называў п. Студніцкага «архіворысам», замест „архіварыус", падкрэсьліваючы гэтым зладзейскія нахілы гэтага пана.

Заслугі, якія пан Студніцкі аказаў у сваім часе яснавяльможным панам, падрабляючы для іх патрэбныя дакументы, або выкрадаючы іх з Віленскага архіва, не забыліся. Студніцкага назначылі загадчыкам архіва і пададзілі надзвычайнымі паўнамоцтвамі па адшуканьні ўсялякіх архіўных дакумантаў. Студніцкі накінуўся на сховы старынных актаў пры розных б. унівэрсітэтах, а ціпер праваслаўных цэрквах, пры розных беларускіх навукова-асьветных установах і г. д. і хапеў усё бяз усякага права захапіць. Гэта яму адзнак не ўдалося, дзякуючы—з аднаго боку—энэргічнаму і дружнаму адпору з боку беларускага грамадзянства, а з другога—нават польская ўлада яго не падтрымала.

Зндак самай горшай маркі, непадобнік усяго беларускага, вядомы злодзей пан Студніцкі выступіў гэтымі днямі на працэсе „Грамады". Віленскія газэты прыводзяць некаторыя моманты яго выступленьня на судзе.

„Кур'ер Віленскі" апісвае гэта так:

«Загад старшыні пазвіць сьведку Студніцкага выклікае агульнае зацікаўленьне. Сьведка ўваходзіць, нясучы бухгальтарскую кніжку. Паказаньні сьведкі—спачатку спакойныя прамовы, пры гэтым—на меры ўзросту нэрвовасьці сьведкі—паказаньні яго трацяць усякую рэальную вартасьць. Яны замяняюцца прамовай, якая мае сваёю мэтаю ўстанавіць палітычнае «крэдо» абвінавачаньня».

Студніцкі быў выкліканы на працэс з спэцыяльнаю мэтаю даць забойчыя паказаньні проці Антона Луцкевіча.

„Сьведка—піша далей „Кур. Віл." —ведае Луцкевіча ўжо 20 гадоў. Заўсёды быў аб ім не

Перад вясеньняй сяўбой.

Кожны вясковы камуніст і камсамолец павінны быць культурнымі гаспадарамі.

У культурным разьвіцьці сельскай гаспадаркі вясковы камсамол пад кіраўніцтвам кампартыі займае значнае месца. Зараз, паколькі ўся наша праца накіравана да культурнага падняцьця і разьвіцьця сельскай гаспадаркі, камсамол вёскі ў гэтых адносінах павінен узмацніць сваю працу. Трэба, каб кожны вясковы камуніст і камсамолец у першую чаргу былі культурнымі гаспадарамі, а таксама рабілі ўплыў на сялянства.

Матар'ялы з месц адносна самастойных гаспадароў-камсамольцаў даюць некаторую магчымасьць даць малюнак, як яны вядуць сваю гаспадарку.

НАРАДА—ЛЕПШАЯ КАЛЕКТЫЎНАЯ ДУМКА.

Каб даць магчымасьць камсамольцам разьвіваць сваю гаспадарку, камсамольскія арганізацыі пачалі шукаць спосабы, якія-б дапамаглі камсамольцам—самастойным гаспадаром падняць сваю гаспадарку. Лепшы спосаб гэта—нарады. Першая нарада адбылася ў 1926 годзе пры Горадкай Акадэміі, пасьля чаго вопыт нарад быў перанесен у іншыя акругі Беларусі. Пасьля горадкай нарады, студэнтамі рабілася абсьледаваньне камсамольскіх гаспадарак, у выніку чаго відаць значнае паляпшаньне. Як відаць, нарады вяўляюцца лепшай калектыўнай думкай.

ХОЧАШ БЫЦЬ КУЛЬТУРНЫМ ГАСПАДАРОМ—ЧЫТАЙ С.-Г. ЛІТАРАТУРУ.

Культурна разьвіваць гаспадарку без літаратуры нельга. Хочаш быць культурным гаспадаром—чытай с.-г. літаратуру. Трэба адзначыць, што з гэтым пытаньнем справа абстаіць ня зусім добра. Камсамольцы ў большасьці ня чытаюць сельска-гаспадарчай літаратуры. Абсьледваньне гаспадарак камсамольцаў паказвае наступныя малюнкі.

Камсамолец ячэйкі Бокшыцы, Слуцкага раёну, К. пабудаваў кармушку для каня, а ня ведае, як яе скарыстаць. З агранома гэты камсамолец зусім ня зьвязан, с.-г. літаратуры ня чытае. Самастойны гаспадар-камсамолец Д., ячэйкі Чапелі, Старобінскага раёну, культурнага ў сваёй гаспадарцы нічога не вядзе, агранамічнай літаратуры ня чытае.

Гэтыя прыклады гавораць аб тым, што камсамол вёскі, асабліва самастойныя гаспадары, павінны імкнуцца да навучаньня с.-г. ведаў. Хоць камсамольцы і прымаюць удзел у с.-г. курсах (у Слуцкім раёне с.-г. гурткі ахопілена 267 чал., з іх 68 камсамольцаў), але практычна ня ўжываюць у сваёй гаспадарцы тых ведаў, якія яны атрымоўваюць у гуртках.

Нам трэба ня толькі камсамольцу, але і кожнаму гаспадару даць зразумелую на яго мове літаратуру, асобнай бібліятэчкай, як вёскі гаспадарку. Дзяржаўнаму выдавецтву варта было-б вывучыць гэту справу і ўжыць канкрэтныя мерапрыёмствы.

ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ПАЖНЕШ.

Калі праглядзець гаспадаркі самастойных камсамольцаў, можна зрабіць вывад, што значная частка іх ня цікавіцца імкненьнем да культурнага паляпшаньня сваёй гаспадаркі. Матар'ялы па Слуцкім раёне сьведчаць аб тым, што ў некаторых камсамольцаў няма зацікаўленасьці ў падняцьці сваёй гаспадаркі. Цікава адзначыць тым, што адзін сэкратар камсамольскай ячэйкі кажа: чаго мне ісьці пайшчыкам у кааперацыю, у ёй нічога дарагога няма. З такімі момантамі камсамольскія арганізацыі на мясцох павінны павесьці самую рашучую барацьбу, паставіўшы перад кожным камсамольцам задачу: паляпшай гаспадарку, імкніся да культуры. А калі гэтага вясковы камсамолец ня хоча рабіць—грош цана яму.

ХОЧАШ, ДЫК БУДЗЕШ КУЛЬТУРНЫМ ГАСПАДАРОМ.

Хто хоча быць культурным гаспадаром, той стане. Калі камсамолец Т. (Магілеўшчына) захацеў стаць культурным гаспадаром, то ён стаў ім і яго гаспадарка зяўляецца прыкладам для ўсяго раёну. Камсамолец Т. завёў шматпольле, дабыў добрае насеньне, робіць досьледы выключна на падставе эканамічнай літаратуры, перабудаваў хлявы, жывёла яго пароды беларускай, але лепшая, як у іншых, падлічан прыход і расход і наогул уся сям'я яго імкнецца да культурнага вядзеньня гаспадаркі. Вось гэта камсамолец, захацеў—усё зрабіў. Гэты прыклад гаворыць, што ніякая гутарка аб тым, што нельга культурна ўядымаць гаспадарку, пад увагу ня можа быць прынята.

ДАЛЕЙШЫЯ ЗАДАЧЫ.

Адным з недахопаў самастойных гаспадароў-камсамольцаў трэба лічыць тое, што ў іх гаспадарцы адсутнічае каштарыс. Некаторыя арганізацыі яшчэ не зрабілі ў гэтай справе належнага пералому. Мала агранамічных сіл, слабае веданьне агранамічнай літаратуры, а калі і чытаюць камсамольцы, то ўхваткамі. Вось недахопы, якія трэба ў бліжэйшы час зьнішчыць.

Далейшыя задачы: **разам з уздымам гаспадаркі імкнуцца да кааперараваньня ўсіх відаў, а там, дзе дазваляе магчымасьць арганізоўваць калектывы з камсамольцаў-самастойных гаспадароў.** Таксама ня трэба паслабляць правядзеньне нарад і шырэй іх разгарнуць пры дапамозе агранома, якія павінны больш цесна зьвязацца з камсамольскімі ячэйкамі, у прыватнасьці з самастойнымі гаспадарамі і дапамагаць ім ісьці па шляху культурнага разьвіцьця гаспадаркі. Камсамольцы-несамастойныя гаспадары павінны ў штодзённай працы рабіць уплыў на палепшаньне гаспадаркі як у сваёй сям'і, так і сярод усяго сялянства.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя газэты просіць усіх чытачоў, карэспандэнтаў, вясковых камсамольцаў, дасылаць допісы аб тым, як камсамол у вёсцы будуе культурную гаспадарку.

Кантрактацыя пасеву лёну.

(Ліст з Бабруйску).

Нязначнае паступленьне лёну-валакна на загатоўчыя пункты ў часе правядзеньня загатоўчай кампаніі сьведчыць аб тым, што пасеў лёну ў акрузе вельмі нязначны, і калі нават ён і вядзецца сялянствам, дык толькі для сваіх гаспадарчых патрэб.

Ільготы па сельска-гаспадарчым падатку для тых сялян, якія ў мінулым годзе засявалі лён, не далі станоўчых вынікаў у сэнсе пашырэньня пасеву лёну. У сувязі з гэтым зараз стаіць у акрузе пытаньне аб найбольшым пашырэньні засеву лёну і, наогул, тэхнічных культур.

Для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыёмства распрацован сталы плян, згодна якога мяркуецца шырокае правядзеньне кантрактацыі пасеву лёну на валакно. Для забесьпячэньня насеньнем лёну акрузе адпушана 2 тысячы пудоў семя лёну-даўгунцу. Пры воцпуску гэтага насеньня бядняцкім гаспадаркам будзе давацца шырокі крэдыт і праводзіцца кантракцыя. Апошняя будзе рабіцца праз нізавую сельска-гаспадарчую каапэрацыю, прычым авансы сялянам будуць выдавацца насеньнем і грашмі.

У часе вясеньняй пасеўнай кампаніі будзе закантрактавана да 2500 гэктараў пасеву звычайнага лёну і 200 гэктараў пасеву лёну-даўгунцу.

Апрача таго, кантрактацыя будзе рабіцца і на пасевы ячменю для здаваленьня сыравінай піваварнай прамысловасьці і бульбы для зінакурнай прамысловасьці. Пасеву ячменю мяркуецца закантрактаваць звыш 600 гэктараў, бульбы да 100 гэктараў.

А. Д.

Кантрактацыя ў Магілеўшчыне.

МАГІЛЕЎ, 19-3. *На патрэбы прамысловасьці сёлета па акрузе будзе закантрактавана 3 тысячы гэктараў нг лён-валакно, 3 с пол. тысячы гэктараў—на семя лёну, 1700 гэктараў на ячмень і, акрамя таго, нязначная яшчэ колькасьць—на бульбу. Апрача таго, для патрэб сельскае гаспадаркі будзе кантрактавацца канюшына, лубін і сэрадэля.*

Крэдытаваньне пасеўнай кампаніі.

Гомель, 20-III. Сельска-гаспадарчым банкам асыгнавана на пасеўную кампанію крэдытаў на 432 тысячы руб. На сельска-гаспадарчыя машыны асыгнавана 103 тысячы, на пасеў канюшыны і іншых траў—93 тысячы, на набыцьцё жывёлы—45 тысяч рублёў.

Калектыўным гаспадаркам, арцелям, таварыствам і бядняцкім гаспадаркам крэдыт адпускаюцца на тэрмін да 7 год.

Як Белсельтрэст зрывае пасеўную кампанію.

У нас ужо пісалася аб тым, што па савецкіх гаспадарках было забраніравана для сельска-гаспадарчай каапэрацыі 40.000 пуд. насеньня аўса. Гэтае насеньне прызначалася для забясьпечаньня сялянства да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Белсельсаюз разьмеркаваў па сельска-гаспадарчых крэдытных таварыствах гэты насённы авёс і, здаецца, усё павінна абстаяць добра.

Але гэта здаецца нам, а вось пабачым, што атрымалася на мясцох.

Нічога не дадзём...

Пясочанскае с.-гасп. крэдытнае таварыства наняло 9 сялянскіх падвод, якія паехалі за 30 вёрст у савхоз „Негарэлае" за насеньнем.

Прыехалі. А ў савхозе кажуць:

— Нічога вам не дадзём. Ну, і на далі, так і прыйшлося падводам ехаць пяражняком да хаты. Праўда, таварыства усё-ж заплаціла сялянам звыш 30 руб.

А зараз сяляне пытаюцца.

— Дзе-ж, кажуць, нам атрымаць насеньне аўса?

Калі ласка, вярніце нашыя грошыкі, што даремна выкінулі...

У саміх няма, а вы просіце...

Прыходзяць прадстаўнікі Грозава-Пухаўскага с.-г. крэдытнага таварыства ў савхоз Аткулавічы.

—Так і так,—кажуць,—вось у нас нават і папяркa ёсьць, адпусьціце 150 цэнтнэраў аўса, што нам даручана Белсельсаюзам.

— Які вам авёс, мы самі маем нарад ад Белсельтрэсту, каб для ўласных патрэб атрымаць 38 цэнтнэраў аўса з савхозу „Цімкавічы",—адказаў нашым каапэратарам прадстаўнік савхозу „Аткулавічы".

Так і пайшлі ні з чым.

Забраніравалі, ды не за вамі...

Працаўнікі Заслаўскага с-гасп. крэдытнага таварыства таксама паведамляюць, што сав. гасп. Сельс не адпусьціла ім на нараду 160 цэнтнэраў аўса. Нават заг... гэта... савхозу і справачку даў, ... увесь лішак у 350-400 пуд. аўса Белсельтрэст забраніраваў для савхозу „Тарасава".

Ёсьць весткі з Цімкавіч...

Добрыя весткі, што і казарыць.

Было ў савхозе на 4 сакавіка каля 1000 пуд. аўса, але...

Ён ужо выдадзены па нарадах Белсельтрэсту савхозам Савічы, Аткулавічы і яшчэ аднаму. Нам кажуць, самім прыдзецца застацца без аўса, ці завозіць яго з іншых месц...

Пішуць аб гэтым з Цытвы, пішуць яшчэ з іншых пунктаў, але досыць ужо і гэтых фактаў.

Як бачыце, весела на мясцох,—злуюцца па савхозах, злуюцца працаўнікі с-гасп. каапэрацыі, злуецца і сялянства, сустракаючы пустыя падводы.

— Лоўка, кажуць, менскія спэцы працуюць: чаго добрага, такі да рэвізіі Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі дапрацуюцца.

В. З—ў.

НА ДАПАМОГУ БЕДНАЦЕ.

(Ліст з Бабруйску).

Кожны асобны момант вясеньняй пасяўной кампаніі мае па мэце шырокую дапамогу вясковай беднаце. Возьмем хоць бы справу здавальненьня сялянства насеньнем. На крэдытаваньне беднаты і наогул сялянства на здабыцьцё насеньня аўса вызначана 40 тысяч крэдытных сродкаў. Побач з гэтым мясцовыя камітэты сялянскай узаемадапамогі выдадуць значную колькасьць насеньнем аўса вясковай беднаце.

У справе пашырэньня травасеяньня таксама прадугледжана дапамога беднаце. На здавальненьне крэдытамі па травасеяньню вызначана сто тысяч рублёў.

Асабліва шырокія льготы беднаце даюцца пры набыцьці мінэральных угнаеньняў і сельска-гаспадарчых прыладаў. Угнаеньне беднякам будзе адпушчацца ў крэдыт нават зусім без задатку. На гэтае мерапрыёмства Акрсельбанкам вызначана 20 тысяч крэдытных сродкаў.

Для большага прасоўваньня ў бядняцкія слаі сялянства буйных сельска-гаспадарчых машын мяркуецца шырока разгарнуць справу арганізацыі беднаты ў машынныя таварыствы. Такіх таварыстваў арганізована 47. На крэдытаваньне адзінаасобных гаспадарак у пакупцы сельска-гаспадарчых машын і прыладаў вызначана да ста тысяч рублёў. Апрача таго, на дапамогу пашырэньню пасеву лёну і карняплодаў у бядняцка - серадняцкіх гаспадарках выдадзена будзе 50 тысяч рублёў крэдыту.

Пракатныя пункты сельска-гаспадарчых машын і прыладаў шырока разгорнуць сваю працу сярод беднаты. Мяркуецца арганізаваць да 50 пракатных пунктаў пры крэдытных таварыствах, калгасах і КСУ. Пракатнымі пунктамі будзе абслугоўвацца выключна беднота.

Вось тая практычная дапамога беднаце вёскі ў час веснавой пасяўной кампаніі. Яна дапаможа бедняку засеяць сваё поле і тым павялічыць сваю гаспадарчую моц.

А. Дамброўскі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Палеская жанчына ўбачыла сьвет.

Старобін знаходзіцца ў глыбі Палесься. Хто ня ведае жыцьця палескай жанчыны з яе цемрай і адсталасьцю да Кастрычнікавай рэвалюцыі?

Але-ж толькі цяпер жанчына ўбачыла сьвет і вышла на шлях новага жыцьця. Ёй цяпер знаёма хата-чытальня з яе працай, ёй цяпер досыць знаёма каапэрацыя, сельсавет і г. д. У якую грамадзкую працу ні кінь вокам, там і жанчына. А чаму-ж ёй і ня быць, калі яна ўжо досыць разумсе неабходнасьць раўнапраўнага ўдзелу ў савецкім будаўніцтве.

Кожны тыдзень, у нядзелю, жанчыны м-ка Старобіна праводзяць свае сходы, дзе абгаварваюць розныя цікавыя пытаньні.

Апрача гутарак часта праводзяцца вечары пытаньняў і адказаў, якімі жанчыны вельмі цікавяцца. Кожны чацьвер жанчыны зьбіраюцца ў хату-чытальню, дзе іх вучаць кройцы і шыцьцю.

Усё гэта кажа нам аб росьце сьвядомасьці жанчыны, аб значным павышэньні яе культурнага ўзроўню.

Варшал М.

М-ка Старобін, Бабруйшчына.

ПОЛЬСКАЯ ХАТА-ЧЫТАЛЬНЯ.

Бабруйск, 19-III. У Бабруйску з 1 красавіка адчыняецца польская хата-чытальня. Хата-чытальня добра абсталёвана. Пры хаце-чытальні будзе працаваць справачнае бюро, якое будзе даваць спраўкі па ўсіх юрыдычных і іншых пытаньнях. Будзе арганізаваны шэраг гурткоў.

Злачынны мэтад ліквідацыі.

Гомель. Быў у Гомелі «Полесторг», якому трэба было ліквідавацца. Мы ня ведаем усіх падрабязнасьцяў, але адзін, выдомы нам, невялікі факт высьвятляе бязглузьдзіцу, пры якой праходзіла ліквідацыя «Полесторга».

Была ў «Полесторга» невялікая партыя акумулятараў Юнгера. Прыстасаваны яны спэцыяльна, як батарэя накалу радыёпрыёмніка. У невялікай скрынцы вьмяшчаюцца дзьве пары акумулятараў агульнай сілы ў 5 з пал. вольт і ў гэткім выглядзе яны вельмі выгодны для радыёаматарскіх мэтаў.

Тавар імпортны, новенькі, і зараз гэткага тавару толькі падавай—увесь разыйдзецца.

Але «Полесторг» недзе гэты тавар хаваў, таму, што на выстаўцы яго ніхто ніколі ня бачыў. А калі падышла ліквідацыя, то акумулятары прадаваліся па 60 капеек за штуку. Між тым, сабекошт акумулятараў—22 р., а рыначная цана каля 40 руб.

Усе акумулятары дасталіся толькі дзьвюм асобам, якія цяпер сьмяюцца над «Полесторгом». Наогул, рэчы ходкія, прададзены задарам.

Пытаньне, якая неабходнасьць прымусіла „Полесторг" збываць савецкі чырвонец за грыўню прыватным асобам. Ці-ж ня мог «Полесторг» перадаць акумулятары Белпайгандлю, ці мясцовай радыёстанцыі.

Гэты факт даказвае, што ліквідацыя „Полесторга" праведзена небазгрэшна і ў гэтую справу павінны ўмяшацца органы РСІ.

Паступленьні страхавых плацяжоў.

Віцебск, 20-3. За апошнія два тыдні на акрузе паступіла ў сельскіх мясцовасьцях 23771 руб. страхавых плацяжоў, а з пачатку кампаніі—376996 руб. Такім чынам дагэтуль заданьне выканана на 91,5 проц.

Магілеў, 20-3. Кампанія па сыскаьню страхавых плацяжоў ня спыняецца. За 15 дзён сакавіка сыскана 36271 руб., а з пачатку кампаніі—592110 руб., што складае 82,1 проц. заданьня.

Менск. Водлуг апошніх даных за 2 тыдні сакавіка па сельскіх мясцовасьцях Меншчыны паступіла страхавых плацяжоў 35111 руб., а з пачатку кампаніі—561348 руб. Такім чынам, заданьне пакуль што выканана на 88,8 проц.

За сродкі ад самаабкладаньня пабудуем 2 школы.

Сяляне Гарбачэўскага сельсавету адзінадушна згадзіліся на правядзеньне самаабкладаньня,—ужо шмат вёсак зьбіраюць грошы.

На сабраныя грошы па саабкладаньню вырашана пабудаваць 2 будынкі для пачатковых школ, маецца на ўвазе скарыстаць сродкі таксама на палепшаньне іншых культурных устаноў вёскі.

СЁМКА.

В. Гарбачоў, Расонскі раён, Полацкай акругі.

Пытаньні рацыяналізацыі земляўпарадкаваньня.

Пасьля XV партыйнага зьезду і ўсесаюзнай земляўпарадкаўчай канфэрэнцыі, якая нядаўна адбылася ў Маскве, ужо цьвёрда ўстаноўлена рашучая і вядучая роля земляўпарадкаваньня ў справе рэканструкцыі нашай сельскай гаспадаркі. На цяперашняй ступені разьвіцьця земляўпарадкаўчых работ, бы яшчэ пры наліччы мэтаду плянавасьці і пэрспэктывы, становіцца відавочным, што пагоня толькі за колькасным размахам земляўпарадкаўчых работ бяз вучоту іх якаснага боку зьяўляецца вялікай памылкай, якая цяжка адаб'ецца ў бліжэйшай будучыне. Пры правільным уяўленьні задач і ролі земляўпарадкаваньня, асабліва пры сучаснай стадыі яго разьвіцьця, нельга дапусьціць яго саматужнага выкаваньня. І земканфэрэнцыя аднадушна канстатавала, што бяз шырока пастаўленай папярэдняй дасьледчай прапрацоўкі пытаньняў земляўпарадкаваньня і без павышэньня кваліфікацыі земляўпарадкаўчага пэрсаналу правільнае вырашэньне пастаўленай задачы немагчыма.

У РСФСР і УССР пры земляўпарадкаўчых Вузах ужо маецца разгорнутая сетка Дасьледчых Інстытутаў, дзе ў складзе земляўпарадкаўчага апарату маецца ўжо 7 проц. асоб з вышэйшай адукацыяй. Мы бачым там аднадушнае прызнаньне неабходнасьці ўсім працаўнікам вытворчасьці з ніжэйшай адукацыяй прайсьці праз сярэднюю спэцыяльную школу, патрабаваньне павялічыць прыцягу інжэнэраў-земляўпарадчыкаў да 30-40, патрабаваньне НКЗ аб адчыненьні новых дзьвюх земляўпарадкаўчых вышэйшых навучальных устаноў, рэальныя пачынаньні ў галіне рацыяналізацыі земляўпарадкаўчага працэсу і тэхнікі, бязупыннае пашырэньне дасьледчай працы і г. д.

Што-ж можна сказаць наконт гэтага ў БССР пры яе складаных формах сельскай гаспадаркі?

Праўда, у нас ёсьць свой земляўпарадкаўчы факультэт і ўжо досыць сталы, добра ўкамплектаваны, выхаванцы якога ўжо пасьпелі сябе добра зарэкамандаваць па вытворчасьці, але чамусьці ён да гэтага часу ня ўцягнут у дасьледчую працу.

Далей, па БССР мы маем усяго толькі 1 проц. асоб з вышэйшай спэцыяльнай адукацыяй.

Я думаю, што земканфэрэнцыя, узяўшы пад увагу невыстарчальную колькасьць земляўпарадкаўчых вышэйшых навучальных устаноў, правільна заварстрыла пытаньне аб курсах на павышэньні кваліфікацыі і ўсямерным скарыстаньні палажэньня аб экстэрнаце пры ВНУ. Імкненьне да павышэньня кваліфікацыі земляўпарадчыкаў надзвычайнае, і пытаньне аб экстарнаце было спаткана горача. І гэта зразумела, бо земляўпарадчыкі па свайму вопыту адчуваюць вялізарную важнасьць задач савецкага земляўпарадкаваньня.

Па БССР курсы перападрыхтоўкі і экстарнат неабходна арганізаваць пры земляўпарадкаўчым факультэце Беларускай Дзяржаўнай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі ўжо з восені 1928 году і зараз-жа падыйсьці да вырашэньня практычных пытаньняў і іх ажыцьцяўленьня, бо прынцыповае вырашэньне Наркамасьветы ў гэтай справе ўжо ёсьць. Па гэтаму пытаньню павінна выказацца ЦВ Земскіцы БССР, прадстаўляючай інтарэсы масы земляўпарадчыкаў, а НКЗ павінен аказаць гэтаму пачынаньню дапамогу.

Таксама неабходна прызнаць хутчэйшую арганізацыю пры Інстытуце імя У. І. Леніна Земляўпарадкаўчага аддзелу, тэрыторыяльна разьмясьціўшы яго ў г. Горках, пры Земфаку Акадэміі.

Экстарнат дасьць Беларусі групу інжэнэраў-земляўпарадчыкаў, якія да гэтага часу па розных акалічнасьцях не маглі атрымаць вышэйшай адукацыі, а арганізацыя дасьледчага земляўпарадкаўчага аддзелу паставіць нарэшце земляўпарадкаваньне ў БССР на моцную навуковую аснову.

Больш выдатныя навуковыя працаўнікі і адказныя кіраўнікі ведамстваў ня думаюць, што цяперашняе асноўнае земляўпарадкаваньне, задачы якога зьнішчыць надзвычайныя ненармальнасьці земляўпарадкаваньня, ня будзе паўторана.

Задачы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пытаньні зямельнай рэгістрацыі, індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі і зьвязаная з ёю інтэнсіфікацыя і вымены ў карыстаньні зямлі, шчыльнейшая ўвязка мэліярацыі і культурна-тэхнічных мерапрыёмстваў па земляўпарадкаваньню, задачы картаграфіі і г. д.—усё гэта яшчэ на раз прымусіць нас вярнуцца да ўжо земляўпарадкаваных вучасткаў зямлі. Гэтыя задачы вымагаюць вопытных, навукова-падрыхтаваных, высока-кваліфікаваных выканаўцаў ужо ў бліжэйшым будучым.

Я думаю, што пытаньням рацыяналізацыі земляўпарадкаваньня ў БССР аддаецца вельмі мала ўвагі і што яшчэ мала ацэнен і скарыстаны факт існаваньня ў Беларусі свайго земляўпарадкаўчага факультэту, факт, якому зайздросьцяць шмат райёнаў РСФСР і аб ажыцьцяўленьні якога марыць Закаўкаская СФСР. Нельга выходзіць пры ацэнцы задач толькі з 5-цігадовай пэрспэктывы.

Гэта пэрспэктыва можа разьвязаць толькі пытаньні, праўда, вельмі важныя, але ўсё-ж пытаньні «сёньняшняга дню». Трэба думаць і аб «заўтрашнім дні» земляўпарадкаваньня.

Адным з галоўных пытаньняў гэтага дню і зьяўляюцца экстарнат і курсы перападрыхтоўкі, у якіх зацікаўлены 99 проц. земляўпарадчыкаў БССР.

Проф. ХАДАРОВІЧ.

г. Горкі.

ЯК ПІЛСУДЗКІ ПАСАДЗІЎ БЕЛАРУСКІ НАРОД НА ЛАЎКУ ПАДСУДНЫХ.*)

Нічога дзіўнага ў падобнага роду дзейнасьці Паўлюкевіча няма. Гэты мэтад заўсёды ўжываюць правакатары. Але сяляне з Заходняй Беларусі разумеюць ролю і значэньне Паўлюкевіча і Беларускай Нацыянальнай Рады. «Беларускае Слова» павінна в сорам прызнацца ў артыкуле пад загалоўкам «Масавы псыхоз» ад 20-X м. г., што ад зва Рады ня прынесла ніякіх вынікаў:

„Даходзяць весткі, што „Грамада" ўсё расьце. Паўстаюць усё новыя і новыя „гурткі". Праўда, нерасьпераганяючы голас адозвы Рады ўнёс пэўнае замяшаньне ў працэс арганізаваньня гурткоў і паслы Грамады павінны былі давець тлумачэньні на сваіх зьездах у Сьвержане і Паставах аб адозве, зноў апушчаючы сялян, што ім нішто не пагражае. Але адозва не магла ўстрымаць росту Грамады, бо супроць масы нетаямнай бібулы, рассыланай Грамадою, адозва была кропля ў моры, а потым масы аканіў нейкі псыхоз, які зьбівае нават прыроднае пачуцьцё асьцярожнасьці, якое гэтак улаcьціва беларускаму селяніну. Ён як зачараваны лезе ў Грамаду, ня бачучы той небясьпекі, якая яму пагражае, ня чуючы ўжо сваім інстынктам, што арганізацыя гэтая яму варожая на сваёй сутнасьці, як гаварылася—пралетарская. Лезе ў партыю, арганізаваную ня любячы сялянскіх партый, як гэта мы бачым у Сав. Расеі, дзе 99 проц. сялянства беспартыйнае».

„Беларускае Слова" павінна было прызнаць рост Грамады і в гэтае прычыны ўзяла на сябе абавязак заклікаць усе правыя партыі дапамагчы польскай паліцыі разагнаць Грамаду і задушыць рэвалюцыйны рух беларускіх сялян.

«І вось, каб гэтых ахвяр было як мага менш, усе беларускія групы, якія не падзяляюць ідэалёгіі Грамады і шчыра апякуюцца лёсам свайго сялянства, абавязаны выступіць на змаганьне з Грамадой. Ня можна сядзець спакойна і толькі канстатаваць, што Грамаду стварыла польская адміністрацыя, паліцыя і г. д., а значыць нікай палякі і самі даюць рады з Грамадою. Трэба бачыць, што Грамада адначасна ня толькі ўдарае па польскай дзяржаве, але ўдарае і па самому беларускаму народу, нясе ў яго душу заразу бальшавізму, бунтарства, дэмаралізацыі і нянавісьці. Нап. Рада свой абавязак барацьбы з Грамадой выконвае на моры сваіх сіл. Цяпер чарод за іншымі беларускімі групамі".

Паўлюкевіч і яго „Беларуская Нацыянальная Рада» не бярэ дарма грошай у польскай дэфэнзыве. Ад некаторага часу вядзе яна палітыку расколу ў гуртках Грамады, што ім дарэчы зусім не ўдаецца. Пасьля некалькіх месяцаў дэзарганізацыйнай і правакатарскай работы ўдалося Беларускай Нацыянальнай Радзе ўнесьці раскол у пяці гуртках Грамады (у агульным гурткоў Грамады каля 700) і з гэтай прычыны «Беларускае Слова» трубіць на ўвесь сьвет аб вялікай перамозе Рады і аб канцы Грамадзе. У артыкуле «З пахмельля» „Беларускае Слова» піша:

«Хто з п'ючых і нап'ючых ня ведае, як нядобра бывае з пахмельля... І галава трашчыць, і сумленьне грызе, і невакой бярэ: ці не ватварыў якой бяды п'яным?..

У гэткім стане хмелю, ці як мы яго неак акрэсьлілі,—стане масавага псыхозу знаходзіліся яшчэ нядаўна беларускія сялянскія масы, пахопчыся ў трывадзіся гурткі.

Нашлюбіся сакоўкай атруты невымаўмых абшчынак і апушчаных слоў Грамады і дуралі, і п'янелі, і... трапляді ў турму...

І вось сёньня мы можам канстатаваць, што нэрыад хмельнага пад'ёму ўжо пачынае праходзіць, наступае ацьверазеньне, а з ім трашчэньне ў галаве і мукі з пахмельля...»

Але некалькі слоў далей. „Беларускае Слова" павінна прызнаць, што Грамада расьце далей. Як-жа стаіць пытаньне з чытачом? І мудрыя журналісты з «Беларускага Слова» тлумачаць гэта законамі... фізыкі! Яны тлумачаць гэта законам інэрцыі:

«Праўда, гэтая цьвярозасьць не аханіла яшчэ масаў. Рост Грамады яшчэ ня спыніўся і па закону інэрцыі яшчэ прадаўжаецца. Але інтэнсыўнасьць росту гурткоў зусім ужо ня тая, што была два месяцы таму назад, а факты развалу гурткоў красамоўна гавораць аб тым, што хутка пачнецца адліў. Гэты адліў распачаўся ад тых райёнаў, дзе сярод кіпучага мора трыумфуючай Грамады ўпалелі, як маленькія выспачкі, сакратарыяты Беларускай Нацыянальнай Рады, а то проста паасобныя сябры і прыхільнікі яе».

Кожны артыкул „Беларускага Слова" канчаецца набожным трафарэтным пажаданьнем:

„Нашае-ж гарачае жаданьне, каб пэрыяд „з пахмельля" хутчэй скончыўся і каб народ сам „вачыльнымі радамі" выйшаў бы змаганьне не за 3-ці Інтэрнацыянал, ці за камуністычны ўрад «работнікаў і сялян», які падсоўвала яму пралетарская Грамада, а за свае нацыянальныя правы, за найдаражэйшы нам ідэал—Вольную, нацыянальна-адзіную Беларусь".

* * *

Іначай асьвятляецца дзейнасьць Грамады на старонках газэты „Сялянская Ніва"—органу Беларускага Сялянскага Саюзу. Газэта гэта выступае супроць сыстэмы прасьледваньня Грамады польскай адміністрацыяй. Яна лічыць, што прасьледваньні ўплываюць толькі спрыяюча для разьвіцьця Грамады.

„Сялянская Ніва" лічыць, што:

«...уся польская палітыка пхне людзей у Грамаду, асабліва людзей ня выраблених палітычна. Пры гэтым адцемлюем беларусам, што ўсякая перамога палякаў над хоць-бы якой беларускай арганізацыяй, а значыцца і над такой, як «Грамада», ёсьць перамогаю польскай над беларусамі і цешыцца з гэтага зусім ня маем патрэбы. «Грамаду" ў інтарэсах беларускай справы трэба перамагчы, але павінны яе перамагчы беларусы, але не палякі",

Прыблізна так аб Грамадзе ў клерыкальнай кадэцкай газэце «Беларуская Крыніца» у № 42 за 1926 г.—чытаем:

«Калі ўсё гэта возьмем пад увагу, то ўбачым, што ўся работа Грамады мае надта слабы фундамент. Гэта будзе вялікая хата на гліняных нагах...

На культурную работу яна мала зьвяртае ўвагі. Досыць успомніць аб тым, што пры арганізацыі Грамады на вёсцы замірае ўся культурная работа, людзі перастаюць нават ладзіць прадстаўленьні, але аддаюцца ўсёй душой палітыцы..

Бяручы пад увагу ўсё гэтае, хацелася-б адзначыць, што жыцьцё Грамады недаўгавечнае».

Фактычнае асьвятленьне дзейнасьці Грамады знаходзім на старонках «Народнай Справы»—органа Грамады. У адказ на ўсе хлусьнёвыя паведамленьні беларускай і польскай прэсы, «Народная Справа» ў шэрагу артыкулаў прыводзіць сваю праграму:

„Ясна для кожнага, што спадзявацца на польскую ўрыжуазею таго ці іншага кірунку—нам няма чагі І пакуль у Польшчы ня скончыцца пара дыктатуры буржуазеі, датуль мы ня можам разьлічваць нават на самую абмежаваную свабоду ў працы над вызвэйсьненьнем нашых нацыянальных і сацыяльных ідэалаў". «Нам шлях—гэта арганізацыя масаў ... культурнае, ... і ... класавае. Толькі ... гэты шлях ... ... галоў—можа выкаваць для нас новыя формы жыцьця. Але гэтая маса мусіць жыць адной супольнай ідэяй, адной супольнай думкай, мусіць стацца добра дысцыплінаванай арміяй, паслухмянай агульным пастановам пракоўных, сьвята выпаўняючай агульную, усенародную волю. У гэтай арміі кожная адзінка павінна ведаць сваё месца і ня шукаць для сябе асабістае толькі помсты, а шукаць выхаду з несьцярпімага для ўсіх прапоўных палажэньня, злучаючы ў вадно сілы паасобных барацьбітоў і расьцярушваючы іх на асабістыя разрахункі".

«Польскі друк прымушан быў прызнацца, што ў беларускага сялянства ўвесь час нарастае варожасьць да польскай адміністрацыі. Гэтак «Кур'ер Віленскі» пісаў: «Душа пагранічнага (крэсавага) мужыка ўсё больш і больш становіцца нам чужой і варожай. Два тыдні назад я пісаў, што псыхіка нашых адміністратараў робіць немажлівым правядзеньне эвалюцыйным шляхам аздараўленьня адносін, пануючых па ўсходніх землях, што толькі шляхам рашучай і яскравай перамены ўсёй сыстэмы кіраўніцтва на Крэсах—магчыма ажыцьцяўленьне аздараўленьня. Сёньня мы павінны быць гатовы, каб у выпадку пастановы ўраду гэтая вымена нават была зараз-жа праведзена, бо добрая воля ўлады не знайшла-б у працягу бліжэйшага пэрыяду часу, адпавядаючага разуменьня сярод сялянства. Занадта далёка зайшлі антаганізмы ў прадоньне, якое 6 гадоў капалі агульнымі сіламі адміністратары і партыйныя дэмагогі, і сёньня стала надзвычайна цяжка, каб яго засыпаць».

На вялікі жаль, польскі ўрад сваёй блізарукай палітыкай ня змог зрабіць належныя вывады з гэтага артыкулу. Замест таго, каб пакласьці рашучы канец свавольству і зьдзеку адміністратараў над працоўным насельніцтвам Заходняй Беларусі, польскі ўрад яшчэ больш павялічыў гэты гвалт і зьдзек, штурхаючы гэтым беларускае насельніцтва на шлях ня толькі арганізацыі навакол Грамады, а часам на больш актыўнае выступленьне супроць занадта далёка зайшоўшых адміністратараў. Прадоньне, якое стварылася ў Заходняй Беларусі, было выкапана рукамі Пілсудзкага праз сваіх «вумных» адміністратараў. Польскі ўрад мог ухіліцца ад падзей, якія ў канцы 1926 і пачатку 1927 г. адбываліся ў Заходняй Беларусі, каб ён найшоў хоць-бы ў некаторых пытаньнях на ўступкі. Але гэтага ня было. Польскі ўрад пачаў вырашаць гэтае пытаньне сыстэмай ланцугоў і бізуна і зусім зразумела, што з гэтага нічога ня выйшла.

Вельмі характэрна тое, што нават некаторыя польскія ўрадавыя газэты ў свой час адзначалі, што сыстэмай тэрору балячкі загаіць ня ўдасца, што хвароба гэтак толькі пойдзе ўглыб, а становішча ў Заходняй Беларусі ад гэтага ў шмат разоў пагоршыцца. Замест гэтага польскі ўрад, нацкоўваемы крэсавай адміністрацыяй і абшарнічтвам, рашыў усю віну перакласьці з хворай галавы на здаровую—з сваёй уласнай галавы, на галовы грамадаўскіх паслоў, грамадзістаў і нацыянальна-сьвядомай беларускай інтэлігенцыі. Гэтак орган Пілсудз

ДА ТЭРМІНУ ЗАСТАЛОСЯ МЕНШ ДВУХ ТЫДНЯЎ.

ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА, ПАКУЛЬ ЯШЧЭ НЯ ПОЗНА.

Даведкі з месц на 15 сакавіка яскрава гавораць, што, ня гледзячы на канчатак тэрміну рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, выніві ўсё-ж зьяўляюцца нездавальняючымі.

Рэалізацыя пазыкі па асобных акругах на 15-Ш дала наступныя лічбы:

Бабруйская акруга рэалізавала на 267104 руб., ці выканала 55,3 проц., заданьня; Мазырская—на 138528 руб., —54,1 проц; Полацкая—на 100897,5р. — 52,6 проц; Гомельская—на 173236 р. —37,5 проц.; Менская—на 158942,5 руб. — 29,1 проц.; Віцебская — на 11100 руб.—28,9 проц.; Магілеўская —на 125123 руб. 27,9 проц.; Аршанская—на 71718,5 руб.—19,5 пр. заданьня.

Агулам па БССР рэалізавана на—1.165.684,5 руб. ці выканана 36,4 пр. заданьня.

З гэтых лічбаў відаць, што на апошнім месцы па рэалізацыі пазыкі ідзе Аршанская акруга, дзе па 15-Ш выканана ўсяго 19,5 проц. заданьня, у той час, як, напр., Бабруйская акруга выканала 55,3 проц. заданьня.

У чым тут справа? Чым тлумачыцца такая вялікая розьніца?

Нам здаецца, што такое становішча можна растлумачыць ні чым іншым, як толькі нядбайнымі адносінамі працаўнікоў і паасобных установаў да справы рэалізацыі пазыкі. Напрыклад, Полацкая акруговая камісія ў сваім інфармацыйным дакладзе паведамляе што «каапэрацыйныя арганізацыі падыходзяць да гэтай кампаніі з фармальнага боку; не вядуць працы сярод пайшчыкаў, не скарыстоўваюць для гэтага каапэрацыйны актыў і ўпаўнаважаных, слаба ўцягнуты ў працу сялянскія камітэты ўзаемадапамогі і члены сельсаветаў».

З гэтага відаць, што мясцовыя райённыя працаўнікі часта лічаць кампанію распаўсюджваньня пазыкі другараднай і не клапоцяцца аб пасьпяховым яе правядзеньні. Вынікам гэтага і зьяўляецца нездавальняючы ход кампаніі. У тых райёнах, дзе мясцовыя працаўнікі зацікаўлены рэалізацыяй пазыкі, выніві больш здавальняючыя. Яскравым прыкладам добра пастаўленай працы можа быць Вульскі райён, Віцебскай акругі, дзе райвыканком мабілізаваў цэлы шэраг таварышоў з райённага актыву.

Каапэрацыйны актыў, у прыватнасьці, упаўнаважаныя ў многіх месцах зусім не скарыстоўваюцца ў справе рэалізацыі пазыкі; амаль ні адно таварыства не прыцягнула ў якасьці субагентаў сваіх упаўнаважаных. Большасьць каапэрацыйных пізавых установ нават лічыла і лічыць нямэтагодным склікаць нараду ўпаўнаважаных для абгаварэньня пытаньняў рэалізацыі пазыкі.

Бываюць выпадкі, калі контрагэнты (каапэрацыйныя ўстановы) выручаныя ад рэалізацыі грошы не здаюць своячасова ў касы райвыканкомаў, а пускаюць іх у зварот на закупку тавараў.

Лясьніцтвы, райённыя аграномы ды іншыя зямельныя работнікі ў рэалізацыі пазыкі ў большасьці амаль ня ўдзельнічаюць, а Наркамзем у гэтым сэнсе ня прыняў адпаведных захадаў.

Вось у кароткіх рысах недахопы кампаніі, на якія ў самым хуткім часе трэба зьвярнуць увагу ўсёй грамадзкасьці.

Рабцэвіч.

ТЭМП РЭАЛІЗАЦЫІ АСЛАБЕЎ.

ХАЛОПЕНІЧЫ, 19-3. За час з 8 да 16 сакавіка ў нашым райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 350 руб., а з пачатку кампаніі—на 5527 руб. 50 кап. Заданьне выканана на 36,8 пр. Трэба адзначыць, што за апошні тыдзень тэмп рэалізацыі аслабеў, і калі так справа пойдзе і надалей, дык заданьне будзе цяжка выканаць.

ПРЫНЯТЫ МЕРЫ ДА ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ТЭМПУ.

КОЙДАНАВА, 19-3. За апошні тыдзень у Койданаўскім райёне рэалізавана сялянскай пазыкі сярод сялянства на 5442 руб. і сярод вайсковых—за 4542 руб. 50 кап. Дагэтуль наш райён выканаў заданьне на 27 проц. Прымаюцца меры да ажыўленьня тэмпу рэалізацыі.

ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНІЦЬ ТЭМП.

СЛУЦАК, 19-3. За апошні тыдзень на Случчыне рэалізавана пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 6735 руб., а з пачатку кампаніі—на 28285 руб. Усё-ж заданьне пакуль што выканана толькі на 46,3 проц. Неабходна тэмп рэалізацыі яшчэ больш узмацніць.

ТРЭБА ПАМЯТАЦЬ, ШТО ХУТКА КАНЧАЕЦЦА ТЭРМІН.

БЯРЭЗІНА, 19-3. У Бярэзінскім райёне за апошні тыдзень прададзена аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 3130 руб. Усяго-ж з пачатку кампаніі па райёну рэалізавана пазыкі на 12.152 р. 50 кап., што складае 30,3 пр. заданьня.

ЗУСІМ СЛАБА.

КАПЫЛЬ, 19-3. Наш райён атрымаў заданьне рэалізаваць сялянскай пазыкі на 60.000 руб., а дагэтуль прададзена аблігацый толькі на 8982 руб. Калі тэмп рэалізацыі пойдзе так і далей, дык напэўна заданьня ня выканаем. Неабходна нашым прапаўнікам падумаць аб узмацненьні тэмпу рэалізацыі.

ВЫКАНАЛІ 51,2 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.

ПЯТРОУШЧЫНА, 19-3. За апошні тыдзень у нашым сельсавеце прададзена аблігацый сялянскай пазыкі на 1130 руб., а з пачатку кампаніі—на 2817 руб. Дагэтуль заданьне па сельсавету выканана на 51,2 процанты.

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАЛІ НА 67,9 ПРОЦ.

АСІПОВІЧЫ, 19-3. З пачатку кампаніі ў нашым райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 17227 р. 50 кап., што складае 68,9 проц. заданьня. Прычым за апошні тыдзень прададзена аблігацый на 1300 руб. Спадзяёмся, што заданьне выканаем поўнасьцю ў тэрмін.

РЭАЛІЗАВАЛІ ПАЗЫКІ НА 267.105 РУБ.

Бабруйск, 19-3. Усяго з пачатку кампаніі па Бабруйшчыне рэалізавана сялянскай пазыкі на суму 267105 р. Такім чынам, заданьне выканана акругай на 55,3 проц. З агульнай сумы на вайсковую падпіску прыпадае 68100 руб.

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАЛІ.

ВОБАЛЬ, 19-3. Вобальскае лясьніцтва (Полаччына) да сёнешняга дню распаўсюдзіла аблігацый пазыкі на 300 руб., чым выканала заданьне на ўсе 100 проц. Зараз лясьніцтва атрымала новую партыю аблігацый пазыкі і прыступіла да рэалізацыі іх. Спадзяёмся, што і гэта выканаем з посьпехам.

На варце краіны саветаў.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ У ЧАНГАРСКАЙ.

(Новабеліцкі кавгарадок).

Асобныя эскадроны Чангарскай кавдывізіі ў гэтым годзе ў значнай частцы папаўняліся беларусамі, сярод якіх ёсьць значная частка актыву.

Практычная праца па беларусізацыі з кожным днём пасоўваецца наперад. Напрыклад, у сапёрным эскадроне арганізован беларускі гурток, у які ўваходзіць каля 25 асоб. Гурток праводзіць кожны тыдзень заняткі, дзе вывучаецца гісторыя Беларусі, а таксама некаторыя сябры, няпісьменныя пабеларуску, навучаюцца грамаце.

Пэрыядычна праводзіцца і разбор літаратурных пытаньняў. Апрача гурткоўых заняткаў, па шматлікавых вечарох у эскадронах з удзелам рабочай моладзі часта можна пачуць выступленьні чырвонаармейцаў з дэклямацыямі і песьнямі на беларускай мове.

Праца па беларусізацыі па ініцыятыве вайсковых мае асабліва вялікае значэньне ва ўмовах Новабеліцы, дзе беларусізацыя сярод рабочых досыць слаба пасоўваецца наперад. Аднаго толькі трэба пажадаць, каб наша праца мела падтрыманьне з боку адпаведных арганізацый.

Ч.

ЯЧЭЙКА ІСНУЕ НА ПАПЕРЫ.

(в. Старыца, Грэскага р.).

Тры гады ўжо ў вёсцы Старыца існуе яч. Осоавіяхіму, але яшчэ і да гэтага часу насельніцтва суседніх вёсак нічога ня ведае аб працы гэтай ячэйкі. Сэкратар яч. т. Верабей ня толькі ня імкнецца пашырыць працу ячэйкі, а нават перашкаджае гэтаму. У студзені месяцы адбыліся перавыбары бюро ячэйкі. На сходзе пастанавілі сабраць грошы і выпісаць вайсковай літаратуры. Сабраныя грошы аддалі т. Верабю, даручыўшы выпісаць патрэбную літаратуру. Літаратура ня выпісана і да гэтага часу. Сэкратаром ячэйкі чамусьці выдзелен ізноў т. Верабей, якому было даручана прыняць актыўны ўдзел у працы вайсковага гуртка. І што-ж мы бачым. Два разы Верабей зьявіўся на заняткі, а калі даручылі яму на наступных занятках зрабіць даклад (праўда, ён абяцаў зрабіць), Верабей не зьявіўся. Сябры гуртка чакалі-чакалі дый разышліся. Цяпер трудна сабраць. Зіма прайшла, а Верабей нават не пакланаціўся склаўшы плян працы. За ўсю зіму не праведзена ніводнага сходу па вёсках с.-савету. Сябры ячэйкі з іншых вёсак с.-с., якія запісаліся ў яч. годдва таму назад, нават ня ведаюць, хто сэкратар яч., і ці ёсьць гэтакі. Верабей ня любіць, калі яму робяць тыя ці іншыя заўвагі, указваюць на недахопы.

Ну, а калі працуе так «сэкратар» ячэйкі, дык што-ж гаварыць аб сяброх. Бюро ячэйкі трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на ўзмацненьне працы на ваенізацыі насельніцтва. Час ня церпіць.

Чапскі.

СУВЯЗЬ З ДЭМАБІЛІЗАВАНЫМІ.

(Новабеліцкі кавгарадок).

Кажны год восеньню шэрагі Чырвонай арміі папаўняюцца новымі маладымі байцамі, перад якімі стаіць двухгадовы пэрыяд вучобы і працы. Кожны-ж час дэмабізуецца з арміі частка чырвонаармейцаў, якія свой тэрмін адслужылі.

Конна-сяпёрны эскадрон Ж-ай Чангарскай кавдывізіі ў гэтым годзе дэмабілізаваў большую палову чырвонаармейскага складу, якія разьехаліся па куткох Беларусі, Далёкага Ўсходу, Забайкалья, Дону і інш. Але эскадрон ня губляе сувязі з дэмабілізаванымі. Для гэтага створана камісія сувязі, якая рэгулярна падтрымоўвае сувязь з дэмабілізаванымі чырвонаармейцамі. Многія з іх яшчэ і дагэтуль застаюцца сталымі карэспандэнтамі чырвонаармейскай насьценнай газэты. Агульнае ўражаньне ад лістоў дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, нават у незначнага з чырвонаармейскім жыцьцём чалавека, складаецца такое, што для гэтых таварышоў вучоба ў казарме засталася лепшым і сьветлым успамінам у іх жыцьці.

Ні адзін ліст дэмабілізаванага не застаецца не зачытаным. На кожным сходзе і вечары чырвонаармейцы з вялікай увагай заслухоўваюць, як адзін з іх т. т. ужо стаў старшынёй сельсавету, а другі—ізбачом, трэці—сэкратаром камсамольскай ячэйкі. Па просьбе дэмабілізаваных, некаторым з іх выпісваецца на дом «Чырвонаармейская Праўда» якая прыносіць шмат карысьці ў справе ваенізацыі насельніцтва.

Чангарац.

СПРАЎЛЯЮЦЬ ХАЎТУРЫ ПА СТРАЛЬБЕ

(Машчаніцкі с-с., Бярэзінскага р.).

З восені мінулага году вайсковая праца ішла нішчатавата і ёю быў абхоплен значны лік пераменнага складу і насельніцтва. Кіраўнік гуртка вайсковых ведаў т. Андрысевіч вельмі шчыра ўзяўся за справу ваенізацыі. Ён прыдбаў стрэльбу, пачаў вучыцца страляць, вывучаць часткі стрэльбы і г. д.

Ня вельмі доўга прышлося ім займацца стрэльбою, бо баявы патрон засеў у рулі і не падначальваўся нікому. Бачачы, што патрон вельмі ўпарты, уздумалі яго выгнаць адтуль цьвікам, але і цьвік застаўся сядзець у рулі побач з патронам. Паставілі нашы «работнічкі» стрэльбу ў куток і пересталі яе шанаваць. Урэшце Андрысевіч панёс яе да «сьлесара» ў в. Восава. Як «сьлесар» вымаў баявы патрон з рулі—нам невядома. Патрон ён выцягнуў, але прыцэльная рамка адпалася. Такім чынам, стрэльба канчаткова сапсавана, а пераменьнікі Машчаніцкага с-с. апусьцілі рукі і спраўляюць па ёй хаўтуры.

Цяпер, калі вы зайдзеце ў сельсавет, дык убачыце наступны малюнак брудная стрэльба з адпаяным прыцэлам стаіць у кутку, на століку побач з селядцамі валяюцца некалькі баявых патронаў, а пад лаўкаю па падлозе валяецца вайсковая літаратура. Інакш кажучы, усё знаходзіцца не на сваім месцы і няма належнай увагі да гэтай працы з боку партыйнай і камсамольскай ячэек. Гэткае становішча далей немагчыма. Трэба Машчаніцкаму актыву сур'ёзна задумацца над гэтай працай і паставіць яе на належную вышыню.

Б. С.

Нарзасядацель--АВІЯХІМУ.

Па каштарысу Нарсудоў на 1927-28 год прызначана па сто рублёў на кожны судовы вучастак для аплаты засядацелям—сялянам за ўдзельнічаньне ў пасяджаньні суду.

Нарзасядацелі—сяляне Нарсуду 7 вуч. Віцебскае акругі (Віцебскі р.). Быкаў, Багдановіч, Буевіч, Бягуноў, Беньямін, Анс, Багатыроў, Багданаў, Вітоль, Восіпаў і Воўкаў, якім першым належыла атрымаць гэтыя грошы, парашылі ад атрыманьня адмовіцца і здаць іх АВІЯХІМУ на пабудову самалёту «Нарзасядацель—сялянін» і выклікаць на гэта ўсіх нарзасядацеляў—сялян Беларусі, у прыватнасьці Віцебшчыны.

Пераменьнікі і начсклад запасу выконваюць заданьні часьцей.

Асноўную працу сярод пераменьнікаў і начскладу запасу (Слуцкага р.) праводзіць 12 асобная вучэбная рота. Працаю ахоплены 9 сельсаветаў райёну і горад. На райёне адчынены 6 вайсковых куткоў: 2 пры хатах-чытальнях, а 4—пры школах і іншых установах сельсавету. У кожны куток роты накіравала неабходнікія бібліятэчкі спэцыяльнай літаратуры. Сярод пераменьнікаў і начскладу заўважваецца вялікая зацікаўленасьць літаратурай. Частка яго бярэ кнігі з ротнай бібліятэкі. Для лепшай працы куткоў выдзелены асобныя загадчыкі з пераменьнікаў і начскладу.

Пры вайсковых куткох арганізаваны вайсковыя гурткі, якімі кіруе непасрэдна начскład роты, які робіць частыя выезды на месцы. Гурткамі ахоплена 90 чалавек пераменьнікаў. Наведвае заняткі гурткоў 50 проц. усіх запісаўшыхся. Апрача таго, аказваецца дапамога 2 гурткам, арганізаваным ячэйкамі ТДА-Авіяхіму. Сябры гурткоў больш цікавяцца практычнымі занаткамі, як стральбой, і лыжнымі спаборніцтвамі, чымся тэарэтычнымі.

Начскład запасу таксама прыцягваецца да працы гурткоў і скарыстоўваецца на ўсе 100 проц.

Апрача таго, праводзяцца агульныя зборы пераменьнікаў для вывучэньня 21-гадзінай праграмы.

П. К-ч.

Зарубежная хроніка.

КІНО АБУЧАЕ САЛДАТ.

У францускай арміі ўведзена абучэньне пры дапамозе спэцыяльных кіно-фільм. Пляны скарыстаньня кіно ў арміі ваготулькі шырокія, што ў кожнай часьці мяркуецца мець кіно-апарат. Пакуль што арганізаваны толькі гарнізонны кіно-тэатры.

Кіно-мэханікамі будуць унтэр-афіцэры. Для іх арганізаваны двухтыдневыя курсы.

НОВАЯ МАРСКАЯ ПРАГРАМА.

Францускі парлямант зацьвердзіў новую суднабудаўнічую праграму, якая прадугледжвае пабудову аднаго крэйсера ў 10000 тон, шасьці лідэраў флётылій па 2300 тон, пяці падводных лодак па 1500 тон і двух пасыльных суднаў па 2000 тон. Гэтыя пасыльныя судны—навіна ў францускім флёце. Пры кожным судне маецца на два дысэлі па 1500 конскіх сіл, дзякуючы чаму яно можа разгарнуць незвычайную шыбкасьць.

ПАНЫ БЮЦЦА—СЛУГІ ГІНУЦЬ.

Пядаўна ў францускіх газэтах былі агалошаны вельмі цікавыя лічбы аб колькасьці казённых тубыльцаў, прымаўшых удзел у сусьветнай вайне на баку Францыі. Аказваецца, за гонар францускай зброі і за прыбыткі францускіх фабрыкантаў ва палёх Францыі і Нямеччыны біліся 550000 тубыльцаў з Афрыкі, Іада-Кітаю, Мадагаскару, Сомалі і выспаў Ціхага акіяну. З іх забіта і загінула бяз ведама да 80000 чалавек. Колькі-ж вярнулася на бацькаўшчыну хворымі, з адарванымі рукамі і нагамі,—газэты ня кажуць.

ВАЕНІЗАЦЫЯ ВУЗ'аў.

З 1923 г. ва ўсіх вышэйшых навучальных установах Італіі ўводзіцца абавязковае вывучэньне ваенных прадметаў, ваенай гісторыі, балістыкі, ваенна-хімічнай справы, страляніны, фартыфікацыі, ваеннай хіміі і шмат іншых. Асаблівая ўвага па вывучэньне ваенных прадметаў зьвернута ў нижэйшых школах.

Па каштарысу---600 тысяч, а на справе---800 тысяч руб.

(СЛОВА НК РСІ АБ ХЛЕБАЗАВОДЗЕ).

На апошнім пасяджэньні калегіі НК РСІ БССР быў заслухан даклад інспэктара тав. Бірыла аб тым, як будаваўся Менскі хлебазавод.

З дакладу дасьледчыка НК РСІ відаць, што праўленьне МЦРК сваячасова паставіла перад адпаведнымі органамі пытаньне аб пабудове хлебазаводу, адшукала патрэбныя для гэтага сродкі і пачало пабудову. Пачаць пабудову можна было і раней, бо будынак, эскізны праэкт і грошы для гэтага былі. Аднак, пабудова пачалася ў лістападзе 1926 году, калі будаўнічы сэзон ужо скончыўся.

Да пачатку будаўнічых работ праўленьне МЦРК ня мела праэкту абсталяваньня сыстэмы апалу і вэнтыляцыі на заводзе.

10-цігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі надыходзіла. Завод хацелася скончыць іменна да гэтага дню. Работу прышлося фарсыраваць і, зразумела, за ўсё пераплачваць.

Прышло сьвята. Пусьцілі завод. Ён мог-бы ісьці, але ня было апалу, з прычыны чаго не магла працаваць брадзільня. Прышлося спыніць завод на 2 з паловай месяцы, каб закончыць будаўніцтва.

Перш за ўсё зьявілася неабходнасьць нанова будаваць рыштаваньні, каб зацягнуць наверх розныя вадаправодныя ўстаноўкі і зьдзіраць у адным месцы толькі што адноўленую страху, каб апусьціць вадаправодны бак. Далей, у кахлянай абліцоўцы сьцен заводу трэба было прабіваць дзіркі для ўстаноўкі паравога ацяпленьня і вэнтыляцыі.

А гэта ацяпленьне і вэнтыляцыі... Праэкт на іх склаў адзіны ў СССР спэц праф. Гофман. Згодна праэкту, ацяпленьне і вэнтыляцыя каштавалі-б 120.000 руб. у той час, калі ўся пабудова заводу была вызначана па каштарысу ў суме 600 тысяч рублёў. Трэба было склікаць спэцыяльную тэхнічную нараду, каб перарабіць праэкт праф. Гофмана прыблізна да 45.000 р.

І вось усё сабралася ў адну кучу: арганізацыйныя выдаткі; зімовая і да таго-ж сьпешная праца; прыпыненьне заводу на 2 з паловай месяцы, з прычыны чаго капітал у 600.000 руб. у працягу гэтага часу ляжаў бяз руху; порча некаторых работ ад холаду, бо ня было ацяпленьня; не прадугледжаныя каштарысам, але патрэбныя і рацыянальныя дадаткі і ўдасканаленьні. У выніку замест 600—800 тысяч рублёў.

Грашовая справаздачнасьць па будаўніцтву хлебазаводу добра не наладжана, з прычыны чаго немагчыма дакладна і ўсебакова вывучыць яго пабудоўку.

Зараз завод працуе ў адну зьмену. Занята 35 рабочых і служачых, падбор і кваліфікацыю якіх МЦРК правёў добра і ўмела. У суткі завод выпякае 400 пудоў хлеба. Канчаецца праца па ўстаноўцы ацяпленьня, вэнтыляцыі. Прыпасоўваецца і ўстанаўляецца замежнае абсталяваньне. Па сканчэньні гэтых работ завод магчыме працаваць у 3 зьмены.

* * *

Заслухаўшы даклад тав. Бірыла і інфармацыю тав. Зінгермана (прадстаўнік праўленьня МЦРК), Калегія НК РСІ паставіла на від праўленьню МЦРК тое, што да пабудовы заводу было прыступлена без праэкту ацяпленьня і вэнтыляцыі, і гэта зьявілася адным з галоўных прычын перавышэньня каштарысу.

Калегія запрапанавала праўленьню МЦРК прысьпяшыць сканчэньне ўсіх работ, каб пусьціць завод у 3 зьмены, і наладзіць справаздачнасьць.

Пастаноўлена давесьці да ведама НК РСІ СССР, што завод «Гидравлика» ня выканаў дагавору з МЦРК адносна ўстаноўкі ацяпленьня і вэнтыляцыі.

Беларусізацыя ў Б.Д.А. Сельскай Гасп.

Прафэсароў, якія карыстаюцца беларускаю моваю 4 (11, 7 проц.), дацэнтаў—10 (59,9 проц.), асыстэнты, асьпіранты і лябаранты амаль усе ўладаюць белмоваю; беларусізацыя канцэляры, бібліятэкі і іншых частак акадэміі, а таксама і ўсіх служачых праведзена на ўсе 100 проц. (глядзі зборнік X кастрычнік 1917-1927 г. г. стар. 4-5).

На першы погляд чаго-ж і жадаць больш. Праца ў галіне беларусізацыі праходзіць ня толькі здавальняюча, а можна нават сказаць добра. Гэтак можна сказаць, прачытаўшы справаздачу праўленьня акадэміі аб беларусізацыі. На жаль, зусім іншае будзе ўражаньне, калі прыглядзецца самому і зацікавіцца бліжэй гэтым пытаньнем. За прыкладамі далёка хадзіць ня трэба. Калі зайсьці ў аўдыторыю і паслухаць, як вядуць заняткі тыя дацэнты, у якіх у праўленьні значыцца, што ён беларусізаваны амаль на ўсе 100 проц., то ня цяжка будзе пераканацца ў адваротным. Дужа часта лекцыі чытаюцца на такой мове, што цяжка разабраць, ці яны чытаюцца парасейску, ці пабеларуску, ці ў перамежку і парасейску і пабеларуску.

Цяпер паглядзім, што дзеецца на практычных занятках. Тут больш-менш заняткі вядуцца сходна,—амаль «выключна» на беларускай мове. Здаецца, калі так, дык усё добра,—аказваецца ня зусім. Бяда ў тым, што некаторыя з навуковых працаўнікоў, якія й беларусізаваны, ня могуць абмежавацца выключна беларускай мовай і поруч з беларускімі тэрмінамі ўжываюць і расейскія. Тыя студэнты, якія ня ведаюць белмовы, бязумоўна запісваюць парасейску, бо нашто яму карыстацца той мовай, якой ён ня ведае. Возьмем такі прыклад: у часе практычных заняткаў па батаніцы наведаўся чаму нейк прынята абазвяковa разам з цыбуляй называць—«лук», разам са скуркай—«кожица», разам з тканінаю—«ткань» і г. д. Ня меней шкодным зьявішчам зьяўляецца і тое, што ў прыватнай гутарцы большасьць навуковых працаўнікоў карыстаюцца расейскай мовай. Выходзіць так, што як быццам беларусізацыя праводзіцца, толькі таму, што гэтага вымагае Наркамасьветы і што яна зусім не патрэбна, бо як толькі даны навуковы працаўнік скончыў заняткі, тады адразу забывае аб ёй.

Вось прыблізна як стаіць справа з беларусізацыяй у навуковых працаўнікоў. Цяпер паглядзім, што дзеецца ў тых установах, дзе, як кажуць, беларусізацыя праведзена на ўсе 100 проц. У першую чаргу возьмем бібліятэку. Тут дык амаль што ня чуваць беларускай мовы, апрача агульнапрынятых слоў, як «добра», «калі ласка», «але» і некалька іншых. Апрача іх усё ідзе на расейскай мове. Добра, калі, зьвярнуўшыся пабеларуску, атрымаеш адказ таксама пабеларуску, бо ў большасьці выпадкаў адкажуць табе, як і ўсім—парасейску. Паглядзім, на якой мове ладзяцца вечары самадзейнасьці. Звычайна прынята тут карыстацца белмовай толькі спачатку і пад канец. Спачатку нехта адзін выходзе і кажа: «Дазвольце лічыць вечар такога та і такога калектыву адчыненым», а пад канец тое-ж самае: „Дазвольце лічыць вечар самадзейнасьці зачыненым". Вось прыблізна ўсё беларускае, што можна там пачуць. Праўда, часам бывае, што праспяюць некалькі беларускіх песьняў, паскочуць лявоніху, ці зложаць адну дзьве «частушкі» па белмове, але гэта бывае даволі радка.

Вось некаторыя недахопы, якія заўважваюцца ў нашай акадэміі з боку беларусізацыі. Пажаданым было-б, каб тое, што лічыцца фармальна на паперы, было сапраўды зробленым, бо ў праціўным выпадку яшчэ ня хутка дачакаемся добрых вынікаў ў Б.Д.А ў галіне беларусізацыі. А беларусізацыя для тых асоб, якія канчаюць акадэмію, бязумоўна патрэбна, бо ніхто іншы, як спэцыялісты па сельскай гаспадарцы найбольш стыкаюцца з сялянствам, дзе бяз белмовы абыйсьціся нельга.

Н. Ш.

Загатоўка валакна лёну прахо-дзіць марудна.

Усімі загатоўчымі арганізацыямі за першую дэкаду сакавіка загатоўлена да 300 тон валакна лёну. Між тым у лютым за першую дэкаду было загатоўлена валакна 388 тон, за другую—336 тон і за трэцюю—251 тона, што наогул давала выкананьне месячнага пляну за люты на 32,8 проц.

На сакавік месяц БССР атрымала ад Саюзнага Нар. Кам. Гандлю заданьне загатовіць 150000 пуд. і адначасова давыканаць лютаўскі плян ці загатовіць дадаткова 140000 пуд.

Такім чынам, у сакавіку неабходна загатовіць валакна лёну 290000 п.

Як відаць з вышэйсказанага, за першую дэкаду сакавіка загатоўлена 18000 пуд., і гэта сьведчыць, як мы яшчэ далёка ад выкананьня настаўленага перад БССР заданьня, бо месячны плян за дзесяць дзён сакавіка выканан усяго толькі на 6-7 процантаў.

Зразумела, што ў гэткім слабым тэмпе загатовак валакна лёну прыходзіцца зноў абвінавачваць пізавых працаўнікоў нашых загатоўчых арганізацый. Загатоўка валакна ідзе вельмі марудна з тэй прычыны, што нашы пізавыя загатоўцы мала дбаюць аб іх узмацненьні.

Трэба яшчэ і яшчэ раз разварушыць пізавую сетку загатоўцаў, каб загатоўчы плян быў выкананы на ўсе 100 проц.

„ПОЛЫМЯ" НА УКРАІНЕ

Як у дарэвалюцыйны час, гэтак і ў часы пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі гісторыя культурна-грамадзкага жыцьця Украіны ва многім была і ёсьць падобна жыцьцю Беларусі. Нацыянальна-сацыяльны прыгнёт раней і палкае разьвіцьцё нацыянальнае культуры зараз. Напаваньне расейскага чыноўніка ў дакастрычнікавую пору і разбойная самачынасьць украінскіх працоўных гушчаў пасьля вялікага Кастрычніка.

На прыкладзе сучаснага культурнага і гаспадарчага будаўніцтва Савецкае Украіны з надзвычайнай выразнасьцю адбіваецца магутная сіла Кастрычнікаўскае рэвалюцыі. Яна рашуча ўзьняла багатыя скарбы украінскае народнае цаліны, разварушыла захованыя ў людзкіх гушчах творчыя сілы і накіравала іх па шлях шырокае чыннасьці.

І вось на нашым ваччу адбываюцца вялікія падзеі ў справе стварэньня маладое Савецкае Украінскае Рэспублікі. Мяжуючы з ёю на поўдні, маючы заўсёднае нагляданьне за украінскім гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, аднак уявіць яго поўнасьцю на воддалёк—зусім немагчыма. Каб гэта было, трэба абавязкова адлучыцца на нейкі час ад штодзённай працы, кінуць Беларусь і паехаць у братнюю Украіну, у яе сталіцу Харкаў. Ачуўшыся там толькі і можаш надчуць той магутны размах адначэльнай сацыялістычнай чыннасьці, якая захапіла сабою украінскія працоўныя гушчы.

Найшырэйшая праца адбываецца ў галіне культурнага будаўніцтва. Пазнаёміцца з гэтаю працаю, з яе дасягненьнямі складала адно з заданьняў аб'яднаньня пісьменьнікаў «Полымя», паслаўшага на Украіну сваіх пяцярых прадстаўнікаў. Асноўнаю мэтаю іх паездкі была мэта навязаньня цясьнейшага зближэньня паміж беларускаю савецкаю літаратурай і савецкай літаратурай украінскай. Да апошніх часоў гэта сувязь паступова разьвівалася, але тэмп гэтага разьвіцьця ўсё-ж быў марудным. Сучаснасьць асабліва востра высунула гэта пытаньне перад беларускаю літаратураю. Апошняя настолькі вырасла, нагэтулькі ўзмацнела, што нацыянальна-геаграфічныя рамкі ёй сталі цеснымі. Выйсьце яе з гэтых рамак, разгарненьня яе ў літаратуру вядомую і цікавую іншым народам, як у межах Саюзу, так і за рубяжом—пытаньне дня.

Леташняя ляда беларускіх пісьменьнікаў у Нямеччыну, Чэхаславаччыну, Латвію і Францыю зрабіла першыя досыць значныя крокі ў справе зближэньня беларускае літаратуры з пралетарскай літаратурай гэтых краін. Патрэба гэтага ў адносінах да украінскай, расейскай, грузінскай, айзэрбайджанскай і іншых савецкіх літаратур стаіць на чарзе. Але калі справа зближэньня паміж беларускай і, скажам, расейскай літаратурай пакуль сустрачае цэлы шэраг перашкодаў, галоўным чынам, з боку расейскіх пісьменьнікаў, то ў адносінах да украінскай літаратуры гэта справа сама сабою натуральна разьвязвалася. Аставалася падагнаць працэс разьвязваньня актам узаемнага наведваньня беларускіх пісьменьнікаў на Украіну, а украінскіх—па Беларусь.

Літаратурны будынак імя т. Блакітнага ў Харкаве лістом запрасіў у Харкаў пяцярых пісьменьнікаў: Янку Купалу, Якуба Коласа, Цішку Гартнага, Міхася Чарота і Міхася Зарэцкага, якія і выехалі ў Харкаў васьмога дню бягучага месяца.

Адзнаньне вялікага значэньня гэтае паездкі дыхтавала нам адпаведны настрой, калі мы марознаю сонечнаю раніцаю апынуліся на вакзале. Сеўшы ў цягнік, Якуб Колас замілавана пачаў сачыць у вакно. Кідаючы погляды ўсьцяж неабмежных сьнегавых прастораў, ён хвіліна ад хвіліны паднімаў іх да сіня-белаватага неба. Пагодлівы дзень спрыяў узьнятасьці пачуцьця. І калі мы пад'яжджалі да радзімы Міхася Чарота, давялося шмат пацешыцца апавяданьнямі яго аб багацьці ваколіц Рудзенску нафтавымі крыніцамі. Далей тэмаю гутарак сталі лясы: іх ашчаднасьць навяла на ўспаміны тых часоў—калі ад Менску да Бабруйску нельга было заўважыць вольнае ад лесу мясьціны. Прышлі на памяць акупацыі, нямецкая і польская. Нагадалася рабаўнічая палітыка Польшчы, якая нішчэдна пляжыць лясное багацьце Заходняй Беларусі. Адназдгна вылаяліся за зьнішчэньне Белавескае пушчы.

Незаўважна, гутарачы, мы праехалі некалькі станцыяў і ачуліся ў Бабруйску. Мігнулі ў нашым ваччу шырокія роўныя вуліцы гораду, старыя яго будынкі, заводы, а раптам і адноўлены праз Бярэзіну мост.

К гэтаму часу неба стала хмурыцца, і Якуб Колас выказаў прароцтва аб зьмене пагоды. Мажліва з гэтае прычыны, за Гомелем ён праказаў, што яму ўжо захацелася дадому. Праўда, гэта было выпадковым настроем. Перад намі адчыняла свае прасторы Радзянская Украіна. Але адначасна за вокнамі вагону пачала разгульвацца завіруха. Яна ўжо была ў поўным разгуле, калі мы спыніліся на станцыі Сновська.

Вымаляваны ў цёмна-зялёны колер будынак станцыі аблепліваўся камякамі сьнегу, ажно навыразнай рабілася адзная надпіс на украінскай мове. Пасажыры бегалі з вагонаў на станцыю і назад, захутаўшыся ў адстаўленыя каўнары. Было да рэчы пажартаваць над Я. Коласам, які выбраўся на Украіну ў вясеньній адзежы. М. Чарот выказаў задавальненьне, што замест паліта ўзяў сваю рамапаўку-кажух. Ды ня дзіва таму—бо вакола суворая зіма спраўляла свой баль. Болей таго, яе бляваньне пачало нам пагражаць няпрыемнасьцямі. Мы адчувалі на сваіх бакох, як цяжка было паравозу рушыць з месца. Рэльсы гінулі ў сьвяту і патрэбна было шмат сілы, каб пацягнуць каля дзесятка вагонаў. Далей, пад Бахмач, ці ў самым Бахмачы да нашага цягніка прычапілі таўхача. Усё ж цягнік са ўскоранага перавярнуўся ў максімку і спакойліва ішоў у густую сьнежную бель. Толькі ад Сум яго хада ўзмацнілася, ня гледзячы на тое, што Сумы далі цягніку шмат новых пасажыраў. Апошнія ў большасьці былі украінцамі—і вагон раптам напоўніўся украінскаю моваю... Дзякуючы сьнежнай завірусе, мы спазьніліся ажно на чатыры гадзіны. З аднаго боку гэта было ня дрэнна, бо мы маглі пазьней паспаць і прыехаць у Харкаў ня ў час, калі ўсе сьпяць. Аднак, спазьненьне цягніка магло пераблутаць плян спатканьня нас украінскімі таварышамі. Апошняе якраз спраўдзілася. Спаткаць нас на вакзал таварышы украінцы прышлі а шостай гадзіне раніцы, і ім давялося вярнуцца назад. Няведаньне на станцыі, наколькі спозьніцца цягнік, прымусіла іх каго прысьці за гадзіну, каго—спазьніцца.

Нас спаткалі загадчык літаратурнага будынку імя т. Блакітнага т. М. Лебедзь і супрацоўнік газэты «Радзянське Село» т. М. Быкавець з аўтамабілямі і фатографамі.

Перад вакзалам прымусілі сфатаграфавацца і пасьля адвязьлі ў прыгатаванае нам памяшканьне. Сюды-ж яны прынясьлі пак газэт і часопісаў, у якіх зьмешчаны пра нас артыкулы, пераклады з нашых твораў, партреты.

Ужо на колькасьці прынесеных нам часопісаў і

Што зрабілі мясцкомы, каб атрымаць прэмію?

500 руб. прэміі. КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“ ОРГАН ЦВК БССР 500 руб. прэміі.

да дню друку—5 мая абвяшчае КОНКУРС:

а) НА ЛЕПШЫ МЯСЦКОМ І ГРУПКОМ ПРАЦАЎНІКОЎ АСВЕТЫ ў справе распаўсюджаньня газэты „Савецкая Беларусь“.
б) НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМ І ГРУПКОМАМ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ па збору падпіскі і распаўсюджаньня газэты „Савецкая Беларусь“.

Хто зьбярэ большы лік падпішчыкаў на газэту, той атрымае ГРАШОВУЮ ПРЭМІЮ:

Першая прэмія мясцкому—60 руб., упаўнаважанаму—75 р.
Другая „ „ 50 „ „ 60 „
Трэцяя „ „ 35 „ „ 50 „

Чацьвертая прэмія мясцкому—20 руб., упаўнаваж.—40 р.
Пятая „ „ 20 „ „ 30 „
Шостая — — — „ 25 „

Сёмая прэмія ўпаўнаважанаму . . . 15 руб.
Восьмая „ „ . . . 10 „
Дзевятая „ „ . . . 10 „

Конкурс будзе цягнуцца 2 месяцы (падпіску праводзіць на красавік і май). З 1-га мая заканчваецца прыём ведамасьцяў на конкурс. ВЫНІКІ КОНКУРСУ БУДУЦЬ АБВЕШЧАНЫ Ў ДЗЕНЬ ДРУКУ—5-га МАЯ.
УВАГА: а) Пры вызначэньні прэміі будзе прынята пад увагу ня толькі колькасьць падпішчыкаў, але і тэрмін падпіскі. КРЭДЫТНАЯ ПАДПІСКА ДАЕ ТЫЯ-Ж ПРАВЫ НА КОНКУРС, ЯК І ПАДПІСКА ЗА НАЛІЧНЫ РАЗРАХУНАК.
б) Ведамасьці па збору падпіскі на конкурс, якія пасылаюць у Кантору газэты ўпаўнаважаныя, павінны быць засьведчаны мясцкомам. Падпіску на конкурс можна зьбіраць ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства.
КОНКУРСНЫ КАМІТЭТ вызначан у наступным складзе: СТАРШЫНЯ—Тав. КУДЗЕЛЬКА (ЧАРОТ), адказны рэдактар газэты „Савецкая Беларусь“. ЧЛЕНЫ: Тав. Баліцкі (Нарком Асьветы); т.т. Платун і Мельнік (ад ЦП Саюзу Прац. Асьветы); тав. Сянькевіч (Заг. Адз. Друку ЦК КП(б)Б); тав. Камлюк (Рэдактар аддзелу „Жыцьцё і Праца Асьветн.“); тав. Касьцюк (Загадчык Канторы газ. „Савецкая Беларусь“). КОНКУРСНЫ КАМІТЭТ.

ЯШЧЭ АДНА ПЕРАМОГА НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Пачала працаваць новая запалкавая фабрыка „Дняпро“.

16 сакавіка пачала працаваць новая пабудованая запалкавая фабрыка «Дняпро» ў Рэчыцы. Гэта фабрыка па магутнасьці займае першае месца ў запалкавай прамысловасьці СССР і належыць да разраду фабрык, пабудаваных па апошнім слову тэхнікі.

Фабрыка мае досыць прыгожую [illegible]ворную архітэктуру і ўнутранае абсталяваньне. Замест старых накатальных адзяленьняў з вялізарнай колькасьцю невялікіх машын і з характэрным для гэтых машын грукам, які адбіваецца на здароўі рабочых, будуць працаваць 7 аўтаматаў. Аўтаматы будуць ня толькі накладваць саломку ў рамы, але і парафінаваць і рабіць запалкавыя галоўкі.

Шмат зроблена і ў адносінах стварэньня спрыяючых умоў для працы на фабрыцы. Удасканалена вэнтыляцыя (каштуе звыш 60 тысяч рублёў); ёсьць пакой, дзе рабочыя чакаюць пачатку працы і інш.

Часова фабрыка будзе карыстацца энэргіяй з невялікай фабрычнай электрастанцыі. Дзеля патаненьня кошту электраэнэргіі, Беларускі запалкавы трэст унёс у ВСНГ на зацьверджаньне праэкт аб пабудове цэнтральнай электрастанцыі пры фабрыцы „Дняпро“, якая будзе абслугоўваць ня толькі новую запалкавую фабрыку ды іншыя прамысловыя прадпрыёмствы, а і насельніцтва Рэчыцы і бліжэйшых вёсак.

На першы час неабходная рабочая сіла, у колькасьці 100 чал., нанята з ліку рабочых старой фабрыкі „Днепр“. Робяцца захады да перакваліфікацыі рабочых. Наогул, на новай фабрыцы будзе працаваць каля 800 рабочых.

Фабрыка будзе вырабляць запалкі стандартнага разьмеру. З пачатку немагчыма будзе разгарнуць працу са ўсёй вытворчай магутнасьцю, г. зн. да разьмеру 1000 скрынак за 8 гадзін, з прычыны неатрыманьня належнага абсталяваньня. У зьвязку з гэтым саломку для новай фабрыкі будуць вырабляць на старой запалкавай фабрыцы.

Што датычыцца вытворчасьці працы, то трэст разьлічвае дасягнуць бяз усякага напружаньня выпрацоўкі 2,5 скрынак на аднаго рабочага, замест 1,25,— павялічэньне на 100 проц.

Капітальнае будаўніцтва ў Белпапертрэсьце.

Белпапертрэст праводзіць у апошнія гады пераабсталяваньне і даабсталяваньне некаторых сваіх прадпрыёмстваў. Значная ўвага аддаецца рацыналізацыі вытворчасьці, зьмяншэньню накладных выдаткаў і на ўжываньне больш тапнага апалу. Усе гэтыя мерапрыёмствы далі ў апошні час пэўны эканамічны эфэкт.

Капітальнае будаўніцтва зараз праводзіцца на фабрыцы «Гэрой Працы» (Добруш). Сёлета на гэтай фабрыцы мяркуецца ўстанавіць магутную папяровую машыну, якая па сваёй прадукцыі заменіць 5 іншых папяровых машын фабрыкі. Апроч таго, пабудавана памяшканьне сілавой станцыі і заказана абсталяваньне для яе (на 3500 кілёват). Таксама атрымана абсталяваньне для саламяна-цэлюлёзнага адзяленьня пры фабрыцы, прычым яно будзе ўстаноўлена яшчэ сёлета.

Саламяна-цэлюлёзнае аддзяленьне будзе абсталёўна больш удасканаленымі машынамі, што дасьць павялічэньне вытворчасьці цэлюлёзы на 250 процантаў.

Капітальнае будаўніцтва фабрыкі мае быць закончана ў працягу 2-х год і будзе каштаваць каля 4,5 міліёнаў руб.

Дзеля патаненьня апалу недалёка ад фабрыкі распачаты торфараспрацоўкі, бо пакуль што фабрыка ўжывае каменны вугаль. З кастрычніка г. г. фабрыка часткова мяркуе перайсьці на апал торфам.

Значная работа праводзіцца па абсталяваньні фабрыкі «Чырвоная Зорка» ў Чашніках, дзе ўстанаўліваюцца новыя рухавікі, турбіны і генэратар.

Капітально рамантуецца 3-я папяровая машына, што дасьць павялічэньне прадукцыі на 60 проц. Усё абсталяваньне і рамонт будзе каштаваць каля 400 тысяч руб.

Дзякуючы паніжэньню накладных выдаткаў, зьніжэньню кошту матар'ялаў і некаторай рацыналізацыі вытворчасьці ўдалося патаньніць прадукцыю ў 1-м квартале на 5 проц. Далейшая рацыналізацыя прадпрыёмстваў будзе залежаць ад паступовага абсталяваньня фабрык удасканаленымі прыладамі і машынамі.

Белпапертрэст абыходзіцца чула з вынаходцамі. На фабрыцы «Гэрой Працы» тэхнік Гурэвіч вынайшоў праэкт удасканаленай лінявальнай машыны. Адміністрацыя фабрыкі вызваліла тав. Гурэвіча ад іншых заняткаў, і ён зараз займаецца выключна сваімі чарцяжамі. Там-жа, на фабрыцы, робіцца падрыхтоўка асобных частак гэтай машыны.

Што-ж датычыцца стандартызацыі прадукцыі, то тут ужо выпрацаван пэўны стандарт адпаведна запатрабаваньням рынку.

Да гэтага часу была некаторая затрымка ў атрыманьні ліцэнзій на ўвоз заграніччнага абсталяваньня, зараз гэтых перашкод ужо няма.

Усебеларускі конкурс на лепшы ў сельска-гасп. адносінах райён.

У хуткім часе мае быць абвешчан усебеларускі конкурс на лепшы ў сельска-гаспадарчых адносінах райён. У задачы конкурсу ўваходзіць: сьцімуляваньне самадзейнасьці гаспадарчага насельніцтва ў напрамку разьвіцьця сельскай гаспадаркі цэлых райёнаў; узмацненьне актыўнасьці ўсіх зямельных, каапэрацыйных і савецкіх органаў у справе арганізацыі і правядзеньня мерапрыёмстваў па разьвіцьці сельскай гаспадаркі ў райёнах; выяўленьне і вывучэньне шляхаў і вынікаў найвышэйшых сельска-гаспадарчых дасягненьняў у сельскай гаспадарцы цэлых райёнаў; павялічэньне каапэраваньня насельніцтва, асабліва бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак шляхам павялічэньня і ўзмацненьня сеткі каапэрацыйных аб'яднаньняў вытворчага тыпу; павялічэньне тавараносьці масавай сялянскай гаспадаркі раёну праз разьвіцьцё больш таварных галін; павялічэньне ўраджайнасьці палявых, садовых, гародніх культур і г. д.

У конкурсе могуць прыняць удзел усе райёны БССР, незалежна ад сучаснага гаспадарчага становішча раёну і разьвіцьця ў ім у сучасны момант зямельнай каапэрацыйнай працы. Агульнае кіраваньне правядзеньнем конкурсу ў межах БССР ускладаецца на асобную конкурсную камісію, а ў межах паасобных культур—на акруговыя насенныя камісіі пры акрвыканкомах. У райёнах, якія прымаюць удзел у конкурсе, будуць утвораны пры РВК асобныя райённыя камісіі па садзейнічаньні правядзеньню конкурса.

Усе райёны, што прымаюць удзел у конкурсе, будуць праводзіць апісаньне сваіх райёнаў па пэўнай праграме цэнтральнай конкурснай камісіі. На падставе гэтых апісаньняў цэнтральная конкурсная камісія будзе рабіць ацэнку дасягненьняў у канкурыруючых райёнах. У ацэнку гэтых дасягненьняў будуць уваходзіць вынікі працы зямельных, каапэрацыйных, грамадзкіх устаноў і арганізацый райёнаў на працягу конкурснага пэрыяду. Пры ацэнцы вынікаў асабліва будзе ўлічвацца праца, зробленая на ініцыятыве і пры ўдзеле сродкаў самога насельніцтва і паасобных грамадзкіх устаноў і вёсак, у прыватнасьці, па арганізацыі шматпалёвых севазваротаў бяз удзелу землеўпарадкавацеляў, па асушцы і закультываньні забалочаных плошчаў і г. д.

Прэміі за вышэйшыя дасягненьні райёнаў вызначаюцца ў досыць буйнай суме. Усяго будзе 21 прэмія, якія падзяляюцца на 5 ступеняў.

Атрыманыя райёнамі прэміі будуць выкарыстаны як на мэты далейшай абудовы сельскай гаспадаркі, так і для прэміраваньня асобных перадавых гасьцінаў, вёсак, гаспадарак.

Паштовая скрынка.

Селькору № 751205-18. Ваш допіс наконт загадчыка чыгуначнай школы ст. Крупкі МБЕ І. Сьмірнова пераслалі ў Нар.Кам. Асьветы.

Зубру (Ленінград). Артыкул—«Твар студэнцкай моладзі»—а друку не падыдзе. Напішыце пра жыцьцё і працу студэнтаў-ленінцаў.

Хроніка.

МЕНСКАЯ АКРУГОВАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ГРУП БЕДНАТЫ.

ВЁСКА НА ШЛЯХУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ.

Пра ўдзел беднаты ў вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі даклад зрабіў загадчык Менскага Акрэа т. Філатаў. З дакладу відаць, што ўлада аддае шмат увагі культурнаму ўздыму сельскае гаспадаркі. Сёлета на разьвіцьцё сельскай гаспадаркі адпускаецца крэдыт на Менскую акругу ў суме 2393000 руб.

Гэты крэдыт будзе скарыстан пераважна на земляўпарадкаваньне, на набыцьцё інвэнтару, жывёлы, насеньня і інш.

Акрамя гэтага, плян прадугледжвае арганізаваць сёлета ў Менскай акрузе 40 калектыўных гаспадарак, 32 малочныя арцелі, 50 мэліарацыйных таварыстваў і 29 тарфяных, каапэраваць 51 пасёлак, арганізаваць 15 машынных таварыстваў і інш. Апрача таго, мае быць каапэравана ня менш 50 проц. сялянскіх двароў (па с-г. каапэрацыі).

ШТО ГАВОРЫЦЬ БЕДНАТА.

Па дакладу т. Філатава адбыліся актыўныя спрэчкі. Адзін дэлегат-бядняк заявіў: **«Гэта канфэрэнцыя ёсьць школа, у якой мы вучымся, як трэба перабудаваць нашу вёску».** Другі дэлегат прывёў прыклад, што ў Халопеніцкім райёне аднаму бедняку далі 100 р. на дабудову хаты, але ён хаты не дабудаваў, а аддаў грошы дзяку, які адчыніў у вёсцы гандаль пад носам у сельсавета. Між тым, сельсавет не праверыў, куды бядняк падзеў крэдыт і ці пабудаваў ён сваю хату. Таксама шмат гаварылі пра тое, што крэдыты поўнасьцю не скарыстоўваюцца. Дэлегатка - сялянка сказала: **„Самаабкладаньне — рэч добрая: яно дапаможа нам пабудаваць яслі і інш.“.**

ТОЛЬКІ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМПАРТЫІ ПЕРАБУДУЕМ ВЁСКУ.

Канфэрэнцыя цалкам далучылася да ўсіх пастаноў камуністычнае партыі, у прыватнасьці, да пастаноў па разьвіцьці сельскае гаспадаркі. Канфэрэнцыя заклікала ўсю беднату да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні вясеньняй пасеўнай кампаніі, **даючы рашучы адпор кулаку**, які спрабуе агітаваць за скарачэньне пасеўнае плошчы. Апрача гэтага, канфэрэнцыя пастанавіла ўцягнуць усю беднату ў сельска-гаспадарчую каапэрацыю, арганізоўваць пракатныя пункты, паступова пераходзіць на пасёлкі, пашырыць мэліарацыйныя таварыствы, весьці рашучую барацьбу супроць няправільнага скарыстаньня крэдыту. Апрача гэтага, канфэрэнцыя ўхваліла цэлы шэраг мерапрыёмстваў па іншых галінах сельскае гаспадаркі. **Наогул, увесь сэнс рэзалюцыі накіраван да калектывізацыі вёскі.**

Учора ўвечары канфэрэнцыя зачынілася.

Падрыхтоўка да перасяленьня яўрэяў-земляробаў у Бірска-Біджанскі райён.

Вядзецца падрыхтоўчая праца да калёнізацыі яўрэямі на Далёкім Усходзе Бірска-Біджанскага райёну, дзе знаходзіцца 2,5 мільёнаў гэкт. зямлі.

Робяцца наступныя захады да засяленьня гэтай яшчэ дзікай краіны.

У Амэрыцы закуплена на 400 тысяч руб. розных с.-г. машын; будуць праводзіцца дароги, канавы і будавацца дамы. Па пляну сёлета мяркуецца правесьці 100 кіл. дарог, 200 кіл. канаў і падняць трактарамі 5000 гэкт. цаліны. (Усе с.-г. работы будуць мэханізаваны на ўсе 100 проц.).

Гэты райён зьяўляецца добрым месцам для разьвіцьця авеч. Для гэтай мэты закуплена партыя шатландзкіх мэрыносаў (на 1.300 тысяч руб.).

Сёлета ў Бірска-Біджанскі райён накіроўваецца 600 пасаленцаў, у тым ліку 200 чалавек з БССР.

Пабудова 2 новых заводаў.

Праўленьне Лесбелу хадайнічае перад ВСНГ аб дазволе пабудаваць сёлета, звыш зацьверджанага пляну, 2-х новых заводаў: у Барысаве для выпрацоўкі гнутай мэблі і ў Гомелі—для выпрацоўкі паркету і шавецкіх калодак для мэханічнага абутку. Агульны кошт абодвых заводаў вылічан у 300.000 руб. Выдаткі на будаўніцтву мяркуецца пакрыць за рахунак перавышэньня лясных прыбыткаў да бюджэту.

160.000 на будаўніцтва лекавых устаноў.

Усесаюзная бюджэтная камісія мэдыцынскай дапамогі адпусьціла Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР 160.000 руб. на пабудоўку новых і рамонт існуючых лекавых устаноў

На 4.500.000 руб. тэкстыльнай прадукцыі.

Водлуг вестак тэкстыльнага трэсту беларускія заводы сёлета выпусьцяць прадукцыі на 4.500.000 руб. Уся гэта прадукцыя тэкстыльтрэсту закуплена па генэральным дагаворы Белнайгандлем.

Урэгуляваньне сацыяльнага складу ў лекавых установах.

Нар. Кам. Асьветы пастанавіў з пачатку будучага навучальнага году ўстанавіць прыём у вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы па курыяльнай сыстэме, г. з., будзе загадзя вызначаны процант прыёму ў кожную навучальную ўстанову па асобных сацыяльных групах. Гэта дасьць магчымасьць лепш урэгуляваць сацыяльны склад навучальных устаноў.

Земляўпарадкаваньне падгародных вёсак.

Сёлета будзе праведзена земляўпарадкаваньне ў падгародных вёсках—М.-Сьляпянка, Шчотаўка і Грабелька на плошчы ў 330 дзес. і ў вёсках—Лошыца і Пятроўшчына—на плошчы ў 400 дзес.

Палепшаньне дабрабыту гораду.

Ад зел камунальнай гаспадаркі сёлета мяркуе пасадзіць на менскіх вуліцах і скверах 400 дэкаратыўных дрэў і 400 кустоў. Апрача таго, будзе зроблена пасадка дрэў у пасёлку «Кам'ярны».

Камісія для барацьбы з трахомай.

Навуковы Мэдыцынскі Савет пастанавіў утварыць камісію для барацьбы з трахомай. У дзейнасьць камісіі ўваходзіць распрацоўка практычных мерапрыёмстваў на барацьбе з трахомай у БССР.

Усебеларускі зьезд эспэрантыстаў.

Усебеларускі зьезд эспэрантыстаў склікаецца на 14 красавіка. У працах зьезду прымуць удзел 40 дэлегатаў ад усіх эспэрантскіх арганізацый Беларусі.

Вывучэньне сельскага будаўніцтва.

Нар. Кам. Аховы Здароўя супольна з Наркамзэмам сёлета будзе праводзіць вывучэньне сельскага атхарывалага будаўніцтва.

Будзе аддадзена таксама вялікая ўвага вывучэньню водазабэзьпеньня вёсак і наогул, сельскага будаўніцтва.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР У МАГІЛЕВЕ.

(Ліст з Магілева).

На нашай, як прынята гаварыць, тэатральнай вуліцы вялікае сьвята.

Адчыніліся гэтымі днямі спэктаклі трупы 1-га Беларускага Дзяржаўнага Тэатру, гастролі якога (трупа ня была ў Магілеве з 1925 г.) заўсёды мелі ў нас вялікі мастацкі і матар'яльны посьпех.

Поўны-пераповнены быў наш Дзяржаўны Тэатр імя Ігнатоўскага ў той вечар, калі здылося адчыненьне,—гэта прышлі рабочыя, чырвонаармейцы, жанчыны-дэлегаткі, вучні пэдтэхнікуму, гэта прыйшлі прадстаўнікі акрвыканкому, акружкому партыі, акрпрафсавету, філіі „Маладняк“ і інш., каб шырока вітаць добрага рэдкага гасьця,—кіраўнікоў БДТ 1.

„Беддзяржтэатр—падкрэсьліў у сваёй прамове загадчык культаддзелу акрпрафсавету т. Казлоў,—грае вялікую ролю ў справе культурнай рэвалюцыі. Мы вітаем яго і выказваем пажаданьне, каб ён стаў блізка да масаў!“.

І на гэтае прывітаньне дырэктар трупы т. Сэлях адказаў:

«Беларускі Дзяржаўны Тэатр, як адзін з застрэльшчыкаў культурнай рэвалюцыі, працаваў да гэтага часу, працуе і зараз, і будзе працягваць працу на карысьць рабочых і сялян Беларусі!»

* * *

Мы падсумоўваем зараз свае ўражаньні, пазагульваем багатыя мастацка-музычныя магчымасьці трупы, наколькі яны выявіліся в першых пастановах.

Ажыла сцэна пасьля прыезду трупы, запалілася, заблішчала, і проста не пазнаць яе, гэткія прыгожыя, стыльныя і эфэктоўныя прайшоўшыя пастаноўкі—„Кастусь Каліноўскі“, „Каваль Вяйвода“ і інш.

У „Кастусі Каліноўскім“ А. Міровіч здолеў аднавіць вельмі цікавую старонку з жыцьця Беларусі ў пасьлядзесятых галох мінулага стагодзьдзя. Здолеў даць багаты малюнак, адпаўлючы эпоху Мураўёўшчыны, усё тое, што мы чулі ў далёкім дзяцінстве ад мясцовых старажыляў.

І вока прагна ловіць усё тое, што канцэлярыя ўсемагутнага часоваага кіраўніка, усемагутнага царскага фарварыта—дыктатара Мураўёва (яго ролю дасканала правёў адзін з таленавітых артыстаў трупы—Грыговіс) у свой час абвешчала і друкавала ў мясцовых і краёвых выданьнях тае эпохі, у тым ліку і ў «Магілеўскіх губэрскіх ведамасьцях» за пасьлядзесятыя гады.

Няхай гэтай старонцы гістарычнага дадзена значная доза рэвалюцыйнай рамантыкі, але ўсё-ж гэта ажывіцца паказальным, глыбока цікавым і надабасцца гледачу.

Чаруе таксама гледача, то прыгожасьцю самых эпізодаў, то прыгожасьцю пастаноўкі, і іншая дасканалая п'еса - фэерыя „Каваль Вяйвода“—таго-ж А. Міровіча.

Багатыя дэкарацыі (мастак Марыкс), добрая музыка (кіруючы Купер), дасканалы хор і балет (Тэраўскі і Галіў)—вось што ўпрыгожвае ўсю п'есу, дае ёй жыцьцё, дуну жывую, эстэтычнае афармленьне.

І мы шчыра расьпіваем зьвыкры Першаму Беларускаму Дзяржаўнаму Тэатру!

Стары журналіст.

КУЛЬТУРНЫЯ НАВІНЫ.

Міжнародны зьезд гісторыкаў у Осло.

Гэтым летам у Осло (Нарвэгія) будзе скліканы міжнародны зьезд гісторыкаў. У працах гэтага зьезду прымае ўдзел і прадстаўнік ад БССР.

Арганізацыя Палескага запаведніка.

Камісія аховы помнікаў прыроды і старажытнасьці БССР пры ІБК пастававіла перадаць Барысаўскі запаведнік пад загад Галоўнаўкі. Таксама пастаноўлена арганізаваць Палескі запаведнік.

Вывучэньне беларускай народнай архітэктуры.

Прафэсар С-Г. Акадэміі інжэнэр Монтаг сабраў шмат экспанатаў і здымкаў народнай беларускай архітэктуры. Усе гэтыя экспанаты зьмешчаны ў музэі пры Акадэміі.

Прыкладны краязнаўца.

Селянін в. Скварцы, Койданаўскага р., Кастусь Вашына, сабраў 2950 слоў, 12 дзіцячых, 50 вясьнянскіх, 6 купальных, 3 вясельных і 6 жніўных песьняў, 4 замовы, 300 прыказак і шмат іншых матар'ялаў.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

16457 чалавек—праз зімовую пляцоўку „Прафінтэрн“.

Зімовая спартыўная пляцоўка «Прафінтэрн» (каток і лыжная станцыя) працавала, дзякуючы спрыяючай зіме, 71 дзень і працаваціла за гэты час 16457 чалавек. Лічба гэта гаворыць за тое, што з гэтага году здаровы зімовы спорт, асабліва канькабежны, знайшоў сабе прыхільнікаў і стаў на шлях папулярызацыі і пашырэньня. Да гэтага году канькабежны спорт быў у Менску і, наогул, у Беларусі слабей развіты, чымсі іншыя галіны спорту (у параўнаньні з дарэвалюцыйным часам), дзякуючы няжкасьці вывучэньня і дарагавізьне інвэнтару.

Бялікія тармазы працы катку—гэта заліка і нагляд за ледам саматужным спосабам, што адчуваецца на якасьці леду і агульнай арганізацыі.

Гаспадару катка КА ЦОПСБ да будучага сэзону трэба пакланаціцца аб правільнай пастаноўцы гэтай справы (правядзеньне вад. праводу і інш.), гэтага вымушае лічба 16457.

Стралковы спорт у Віцебску.

У Віцебску былі праведзены студэнцкія стралковыя спаборніцтвы, у якіх прыймала ўдзел 7 калектываў.

Першае месца (першы прыз) атрымаў калектыў Савпартшколы, які зрабіў вельмі добрае дасягненьне, выбіўшы з 125 магчымых—107 ачок.

Стадыён у Бабруйску.

Бабруйскі Акрапрфсавет пастанавіў пабудаваць стадыён (разьлічаны на 16000 чалавек) на працягу 5 год. Пабудова пачнецца ў гэтым годзе і будзе каштаваць 70 тысяч рублёў.

СУД.

Гульня з лесам.

Грамада. пасёлку Янава, Путчанскага сельсавету, Койданаўскага райёну, Стась Кароль быў упаўнаважаным над лясамі мясцовага значэньня і кіраваў скарыстаньнем іх.

Але якое было кіраўніцтва?

Стась Кароль лічыў, што зусім не патрэбна дагляданць за лесам: расьце лес—ну, і няхай расьце.

Калі трэба было Каролю купіць швейную машыну, а грошай ня было, ён ехаў у лес, рубаў больш каштоўныя дрэвы і прадаваў на рынку.

Некаторыя сяляне прабавалі даказваць Каролю, што лес—ня грыбы: зрэзаць нядоўга, а вырастаць—трэба шмат гадоў.

Кароль звычайна адказваў:

— Чаго зарыкалі? Я, брат, дзейнічаю на інструкцыі, у якой дакладна чорным па белым напісана, што дрэвы з лясоў мясцовага значэньня мае права адпускаць упаўнаважаны. Вось я і адпускаю.

— Добра ты адпускаеш,—гаварылі сяляне.—Сам сабе.

А нам хто і калі будзе адпускаць лес?

— Вам? Таксама я. Зьбярыцеся на сходку, зрабіце пастанову і рубайце лес хоць заўтра.

— А адказваць ня будзем?

— Завошта, перад кім? Вось чудакі!

Назаўтра насялкоўцы Янава сабраліся на сходку і пачалі абмяркоўваць пытаньне наконт лесу.

Праз некаторы час на сходку прышоў і ўпаўнаважаны Кароль.

— Ну, як, хлопцы, абмеркавалі?

— Сеч, сеч.—Гучна закрычалі кулакі.

Тут распачаліся спрэчкі: беднота даказвала, што водпускам лесу кіруе лясьніцтва і адпускае лес па пляну, а кулакі крычалі, што лес—не зямля і плянаў тут ні прычым, бо калі, значыцца, мясцовы лес, дык ён—наш, і мы гаспадары, а не лясьніцтва.

Выслухаўшы спрэчкі, Стась Кароль падняўся з лаўкі і сказаў:

— Інструкцыі я ня чытаў, але добра памятаю, што лясьніцтва кіруе дзяржаўнымі, а не мясцовымі лясамі, і што мясцовы лес—уласнасьць насельніцтва.

— Дудкі, Стась, ты памыляешся! На лясы і зямлю ўласнасьці няма, гэта табе не стары рэжым. Прачытай лясны кодэкс, дзе не напісана, а надрукавана ўсё ясна і зразумела.

Стась Кароль—упарты чалавек. Апошнія спрэчкі яму не спадабаліся. Ён махнуў рукой і крыкнуў:

— Я дазваляю рубаць лес і будавацца, а там будзе відаць!

Раніцай фурманка за фурманкай імчаліся ў лес, прычым Кароль ехаў наперадзе. Застукалі тавары, зазьвінелі пілы—і 455 дрэў к вечару ляжалі на зямлі.

Калі Стася Кароля прыцягнулі да адказнасьці за невыкананьне інструкцыі пры водпуску лесу, ён паняўшы, што інструкцыі ня чытаў—ня было часу, а да таго-ж жонка згубіла недзе гэту інструкцыю.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Стася Кароля на год зьвыпраўленьня з суровым адмежаваньнем, але на аснове амністыі ад трыманьня пад вартай вызваліў.

Д. Кастроў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і СНК БССР

пра дапаўненьне Кодэксу Законаў аб Працы БССР артыкулам 93¹.

На падставе артыкулу 2 пастановы III сэсіі ЦВК БССР IV скліканьня за 26 ліпеня 1923 году «Аб парадку ўнесеньня зьмен у кодэксы, зацьверджаныя ЦВК Беларусі» (З. З. БССР 1923 г., № 13—14, арт. 115) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць дадаць да Кодэксу Законаў аб Працы БССР артыкул 93¹ у наступнай рэдакцыі.

„93¹. Для спрачак, узьнікаючых пры ўжываньні наймовае працы, устанаўляецца трохгадовая іскавая даўнасьць. Для спрачак аб прыняцьці назад на пасаду і аб аплаце вынужанага прагулу, устанаўляецца шасьцімесячная іскавая даўнасьць».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарняноў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Закратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

г. Менск. 1 сакавіка 1928 году

ПАСТАНОВА Савету Нар. Камісараў БССР

пра палепшаньне матар'яльна-бытавога становішча райённых спэцыялістаў сельскай і лясной гаспадаркі.

Каб забясьпечыць пасьпяховае разьвіцьцё розных галін сельскай і лясной гаспадаркі і забясьпечыць іх кваліфікаванымі персаналам, а таксама, каб палепшыць матар'яльна-бытавое становішча гэтага персаналу, які працуе ў сельскіх мясцовасьцях, над адбудовай сельскай гаспадаркі Савет Нар. Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Забясьпечыць, пачынаючы з 1927-28 бюджэтнага году, райённы агранамічны, ветэрынарны і лясны пэрсанал і спэцыялістаў дасьледчых станцый у райёнах бясплатнымі кватэрамі або патрэбнымі сродкамі на наймальне кватэр у разьмеры да 5 руб. на месяц, а таксама спэцвопраткаю.

2. Забясьпечыць агранамічны, ветэрынарны і лясны пэрсанал і тэхнікаў сельскага і агнятрывалага будаўніцтва транспартнымі сродкамі для службовых разъездаў, для чого ўключыць у дзяржаўны і мясцовы бюджэты, пачынаючы з 1927-28 бюджэтнага году, патрэбныя сродкі.

3. Устанавіць для кваліфікаванага райённага агранамічнага і каморніцкага пэрсаналу, ветэрынарных лекараў і тэхнікаў сельскага і агнятрывалага будаўніцтва, а таксама для лясьнічых і іх памоцнікаў і спэцыялістаў дасьледчых станцый у райёнах тры пэрыядычныя дабаўкі, па 10 процантаў кожная, да іх заработнай платы за кожныя тры гады працы ў райёне, лічачы тэрмін вучасткоўай працы на спэцыяльнасьці з 1-га студзеня 1928 году.

4. Для павышэньня кваліфікацыі спэцыялістаў, практыкаваць камандираваньне на льготных умовах падрыхтаваных працаўнікоў ніжэйшай і сярэдняй кваліфікацыі з значным практычным стажам у Беларускую С.-Г. Акадэмію і забясьпечваць іх стыпэндыямі.

5. Працуючым на вучастках у БССР ветэрынарным лекарам, аграномам, лясьнічым і спэцыялістам дасьледчых устаноў у райёнах могуць давацца Народным Камісарыятам Земляробства праз кожныя пяць гадоў навуковыя камандыроўкі тэрмінам да трох мясяцаў за кошт Народнага Камісарыяту Земляробства, захоўваючы за камандыраванымі іх заработную плату і кватэру.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.
г. Менск. 5 сакавіка 1928 году.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ Центрального Исполнительного Комитета и СНК БССР

о дополнении Кодекса Законов о Труде БССР статьей 93¹.

На основании статьи 2 постановления III сессии ЦВК БСС IV созыва от 26 июля 1923 года „О порядке внесения изменений в кодексы, утвержденные ЦИК Белоруссии“ (С. У. БССР 1923 г., № 13—14, ст. 115) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют дополнить Кодекс Законов о Труде БССР статьей 93¹ в следующей редакции:

„93¹. Для споров, возникающих при применении наемного труда, устанавливается трехлетняя исковая давность. Для споров о восстановлении в должности и об оплате сверхурочных работ устанавливается шестимесячная исковая давность“.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Черняков.
Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.
1 марта 1928 г.
г. Минск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ Совета Нар. Комиссаров БССР

об улучшении материально-бытового положения райённых специалистов сельского и лесного хозяйств.

Для обеспечения успешного развития разных отраслей сельского и лесного хозяйства и обеспечения их квалифицированным персоналом, а также для улучшения материально-бытового положения этого персонала, который работает в сельских местностях, над восстановлением сельского хозяйства Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Обеспечить, начиная с 1927-28 бюджетного г., районный агрономический ветеринарный и лесной персонал и специалистов исследовательских станций в районах бесплатными квартирами или нужными средствами на наем квартиры в размере до 5 руб. в месяц, а также спецодеждой согласно норм.

2. Обеспечить агрономичный, ветеринарный и лесной персонал и техников по сельскому и огнестойкому строительству транспортными средствами для служебных раз'ездов, для чего включить в государственный и местный бюджеты, начиная с 1927-28 бюджетного г., необходимые средства.

3. Установить для квалифицированных районных агрономов и землеустроителей, ветеринарных врачей и техников по сельскому и огнестойкому строительству, а также для работников лесничеств (лесничих и их помощников) и специалистов исследовательских станций в районах 3 периодические прибавки, по 10 проц. каждая, к их заработной плате за каждые 3 года работы в районе считая срок работы по специальности на участке с 1-го января 1928 года.

4. Для повышения квалификации специалистов, практиковать командирование на льготных условиях наиболее подготовленных работников высшей и средней квалификации с значительным практическим стажем в Белорусскую Сельско-Хозяйственную Академию и обеспечить их стипендиями.

5. Работающим на участках ветеринарным врачам, агрономам, лесничим и специалистам исследовательских учреждений в районах могут предоставляться Народным Комиссариатом Земледелия, через каждые 5 лет научные командировки сроком до 3-х месяцев за счет Народного Комиссариата Земледелия, с сохранением за командированными их заработной платы и квартир.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.
Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.
г. Минск. 5 марта 1928 года.

Апавяшчэньні.

— Сёньня, 21 сакавіка, адбудуцца чарговыя заняткі сэкцый пры дэлегацкіх сходах: каапэрацыйнай—у будынку ЦЦРК, юрыдычнай—у будынку акр. пракуратуры, „охматмлада“—у акрздраве, сацыяльнага выхаваньня і друку—у акр. жанаддзеле, а ў чацьвер, 22-III—прафэсіянальнай сэкцыі—у габінэце клюбу імя Карла Маркса.

— У памяшканьні Гаррайкому КП(б)Б у чацьвер, 22 сакавіка, а 6 з палов. гадз. увечары адбудзецца нарада старшынь шэфскіх выхан. бюро, якія шэфоствуюць над